ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 20 (2073)
8 сакавіка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДА САВЕЦКІХ ЖАНЧЫН

ЗВАРОТ ЦК КПСС У СУВЯЗІ З МІЖНАРОДНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНЁМ 8 САКАВІКА

Дарагія таварышы жанчыны, нашы слаўныя працаўніцы, актыўныя будаўніцы камунізма!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза горача віншуе вас з Міжнародным жаночым днём — 8 Сакавіка, баявым святам салідарнасці жанчын усяго свету ў барацьбе за дэмакратыю і сацыялізм, свабоду і раўнапраўе, нацыянальную незалежнасць, за мір ва ўсім свеце.

У гэтым годзе Міжнародны жаночы дзень 8 Сакавіка ў нашай краіне святкуецца асабліва ўрачыста. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у знак выдатных заслуг савецкіх жанчын у камуністычным будаўніцтве і ў абароне Радзімы гэты дзень аб'яўлен нерабочым. Ён адзначаецца ў пярэдадзень XXIII з'езда КПСС. У краіне разгарнулася ўсенароднае абмеркаванне праекта Дырэктыў з'езда па новаму пяцігадоваму плану, які з'явіцца важным этапам у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, у далейшым уздыме дабрабыту працоўных.

Савецкія жанчыны сваімі патрыятычнымі справамі і самаадданасцю здабылі глыбокую павагу ўсяго нашага народа. Разам з мужчынамі яны беззапаветна змагаліся за ўладу Саветаў, геранчна адстойвалі заваёвы пралетарскай рэвалюцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, унеслі велізарны ўклад у сацыялістычнае пераўтварэнне Радзімы.

Выхаваныя Камуністычнай партыяй на ідэях марксізма-ленінізма работніцы і калгасніцы, інжынеры і тэхнікі, урачы і настаўніцы, дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва — усе савецкія жанчыны аддаюць свае сілы і веды вялікай справе перамогі камунізма ў нашай краіне.

Упершыню ў гісторыі чалавецтва Краіна Саветаў забяспечыла жанчыне роўныя правы з мужчынам, прадаставіла ёй шырокія магчымасці для раскрыцця сваіх талентаў і здольнасцей. Савецкія жанчыны займаюць віднае месца ў народнай гаспадарцы краіны, у кіраванні дзяржавай, яны паспяхова кіруюць школамі, фабрыкамі, заводамі, калгасамі, саўгасамі, інстытутамі, медыцынскімі і бытавымі ўстановамі. Тысячы жанчын выбраны ў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады — Вярхоўны Савет СССР, Вярхоўныя Саветы саюзных і аўтаномных рэспублік, а таксама ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Заслугі савецкіх жанчын перад Радзімай па вартасці ацэнены партыяй, урадам, народам: звыш мільёна жанчын удастоены ўрадавых узнагарод, тысячы жанчын — Героі Сацыялістычнай Працы, Героі Савецкага Саюза.

Усенароднай увагай, любоўю і клопатамі акружана ў нашай краіне жанчына-маці. За высакародную працу па выхаванню падрастаючага пакалення дзесяткі тысяч савецкіх жанчын удастоены ганаровага звання «Маці-Гераіня», мільёны жанчын узнагароджаны ордэнам «Мацярынская слава» і «Медалем мацярынства».

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад лічаць сваім абавязкам і ў далейшым нястомна клапаціцца аб паляпшэнні ўмоў працы і быту жанчын, прадастаўляць ім усе неабходныя магчымасці для павышэння ведаў, культурнага адпачынку, дапамагаць ва ўмацаванні сям'і, выхаванні дзяцей. У новай пяцігодцы значна ўзрасце колькасць дзіцячых дашкольных устаноў, шырокім фронтам будзе ісці жыллёвае будаўніцтва, намнога павялічыцца аб'ём культурна-бытавых паслуг насельніцтву, якія аблягчаюць хатнюю працу жанчын.

Савецкіх жанчын, іх сябровак з брацкіх сацыялістычных краін, як і працоўных жанчын усёй зямлі, аб'ядноўвае агульнае імкненне да міру. Жанчыны патрабуюць неадкладнага спынення ваеннай інтэрвенцыі амерыканскага імперыялізму ў Паўднёвым В'етнаме і яго агрэсіўных дзеянняў супраць Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, рашуча выступаюць супраць аснашчэння заходнегерманскіх рэваншыстаў ядзернай зброяй. У першых радах барацьбітоў за ўмацаванне міру, за свабоду і незалежнасць народаў заўсёды ішлі і цяпер ідуць савецкія жанчыны.

Савецкія жанчыны горача падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку нашай партыі і ўрада. ЦК КПСС выказвае ўпэўненасць, што вы, верныя дочкі сваёй краіны, і ў далейшым не пашкадуеце сіл, ведаў і творчай энергіі для далейшага ўмацавання сацыялістычнай Айчыны, для перамогі камуністычных ідэалаў.

Дарагія таварышы жанчыны! Нашы маці, сёстры, сяброўкі!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза горача жадае вам вялікіх поспехаў ва ўсіх вашых справах і добрых пачынаннях, добрага здароўя, радаснага і мірнага жыцця.

Гонар і слава савецкім жанчынам!

Няхай жывуць працоўныя жанчыны ўсяго свету!

Няхай жыве Міжнародны жаночы дзень — 8 Сакавіка!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ПІСЬМЕННІКА КРАПІВЫ (Атраховіча) К. К. ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

За вялікія заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць пісьменніка Крапіву (Атраховіча) Кандрата Кандратавіча ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ПАДГОРНЫ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль. 5 сакавіка 1966 г.

НАРОДНАМУ ПАЭТУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа падрыхтавалі да друку альбом-выстаўку «Жыццё і творчасць Якуба Коласа». Гэта багата ілюстраваны летапіс жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры. У ім змешчаны фотаздымкі, рэпрадукцыі карцін, ілюстрацыі да твораў, дакументы, якія суправаджаюцца цікавым тэкставым матэрыялам.

Альбом — каштоўны дапаможнік не толькі для вучняў школ і выкладчыкаў роднай мовы і літаратуры, ён можа быць выкарыстаны для арганізацыі выставак у музеях, школах, клубах, бібліятэках.

Падрыхтаваны таксама да друку зборнік артыкулаў «Народны настаўнік Якуб Колас». У ім расказваецца аб дзейнасці народнага паэта на ніве народнай асветы, якой Канстанцін Міхайлавіч аддаў каля трыццаці гадоў свайго жыцця. У зборніку змешчаны артыкулы аб навучанні дзяцей, погляды на педагогіку, пісьмы да настаўнікаў і былых выхаванцаў, з якіх чытач даведаецца пра высакародныя рысы народнага настаўніка, выдатнага выхавальніка і сябра моладзі.

Альбом і зборнік выпускаў выдавецтва «Народная асвета».

У Віталіі Вайцаховіч, адной з лепшых прадзільшчыц Мінскага [тонкасуконнага] камбіната, шмат сяброў. І ўсе яны шчыра віншуюць яе сёння са святам жанчын.

Фота А. УСЦІНАВА.

УСЕНАРОДНАЯ ПАШАНА

Пятага сакавіка паэту, байкапісцу, празаіку, драматургу, вучонаму Кандрату Кандратавічу Крапіве споўнілася семдзесят гадоў. Гадавіна з дня нараджэння народнага пісьменніка стала сапраўдным святам нашай літаратуры, нашай нацыянальнай культуры. Ва ўсіх кутках Беларусі, у гарадах і пасёлках, клубах і бібліятэках адбыліся літаратурныя вечары і ўрачыстасці з выпадку 70-годдзя з дня нараджэння любімага пісьменніка.

Вялікі вечар, прысвечаны юбіляру, адбыўся 5-га сакавіка ў Мінску, у памяшканні Тэатра імя Янкі Купалы. Павіншаваць народнага пісьменніка і вядомага вучонага сабраліся прадстаўнікі фабрык і заводаў сталіцы, навуковых і навучальных устаноў, партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, пісьменнікі, кампазітары, работнікі мастацтваў.

У прэзідыуме сходу — першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў, Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Ц. Я. Кісялёў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў, сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі П. У. Броўка, прэзідэнт Акадэміі навук БССР В. Ф. Купрэвіч, міністры, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх, культурна-асветных арганізацый, землякі юбіляра, госці з братніх рэспублік.

Вечар уступным словам адкрыў Пятрусь Броўка. Ён гаворыць аб вялікім укладзе, які ўнёс у беларускую літаратуру Кандрат Крапіва, падкрэслівае, што яго шматлікія творы сталі здабыткам усяго савецкага народа, атрымалі ўсеагульнае прызнанне.

Сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч зачытвае прывітанне ЦК КПБ, Савета Міністраў і Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, адрасаванае юбіляру, віншуе Кандрата Кандратавіча з высокай урадавай узнагародай—ордэнам Леніна.

З дакладам аб жыццёвым і творчым шляху Кандрата Крапівы выступіў Янка Казека.

На вечары народнага пісьменніка віталі прадстаўнікі Мінскага абкома КПБ і аблвыканкома, Міністэрства культуры СССР, Саюза пісьменнікаў і Акадэміі навук БССР, камандавання БВА, тэатраў, культурна-асветных устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, заводаў і фабрык, ЦК ЛКСМБ і інш.

Прыйшлі віталь юбіляра і юныя піянеры Мінска. Ад імя ўсіх дзяцей сталіцы яны паднеслі Кандрату Крапіве падарункі.

На ўрачысты вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы, прыехалі землякі народнага пісьменніка. Ад імя жыхароў вёскі Нізок, хлебаробаў калгаса «Чырвоны Кастрычнік» калгасніца Марыя Крупнік, старшыня калгаса І. Ігнатовіч, сакратар Дзяржынскага райкома партыі П. Ганчароў і самадзейны кампазітар, заслужаны дзеяч культуры БССР П. Шыдлоўскі паднеслі юбіляру хлеб-соль.

Юбіляра вітаў ад імя праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Ул. Піменаў, прадстаўнікі пісьменніцкіх арганізацый Украіны А. Бажанка і А. Саўчук, Літвы—Э. Матузявічус, Латвіі — Е. Стулпан.

Цёпла віталі Кандрата Кандратавіча купалаўцы — артысты тэатра, дзе ўпершыню ўбачылі свет амаль усе п'есы юбіляра.

Са словам у адказ выступіў горача сустрэты прысутнымі Кандрат Крапіва.

— Сардэчнасць і цеплата, — гаворыць ён, — якія я адчуў сёння на гэтым вечары, вядома ж, адрасуюцца не толькі мне. Яны з'яўляюцца выражэннем сардэчных і зычлівых адносін савецкага грамадства да пачэснай працы пісьменніка, выражэннем давер'я нашай партыі да савецкай літаратуры, якая заклікана даваць людзям эстэтычную асалоду, адлюстроўваць велічныя справы народа, змагацца з усім тым, што перашкаджае руху наперад.

Каштоўнасць працы пісьменніка і вызначаецца тым, на якім мастацкім і ідэйным узроўні ён выконвае гэтыя пачэсныя задачы. Некаторыя лічаць, што для пісьменніка талент — гэта ўсё. Пісьменніцкі талент — гэта дар прыроды, і ніякай сінтэтыкай або кібернетыкай яго не заменіш. Але як гэты дар божы будзе выкарыстаны, залежыць ад самога чалавека, ад добрай волі таго, каму гэты дар дастаўся. Калі да таленту не прылажыць працы, дык ён можа застацца толькі патэнцыяльнай магчымасцю або пайсці на дробныя вырабы. Апрача таго, пісьменніку неабходна мець пэўны светапогляд, займаць акрэсленыя ідэйныя пазіцыі, каб ведаць, на карысць якіх грамадскіх сіл накіраваць яму свой талент. У схеме ўсё гэта здаецца простым і зразумелым, але жыццё, якое прыходзіцца пісьменніку адлюстроўваць у сваіх творах, вельмі складанае. Душа чалавечая, якую ён павінен пазнаць да самой глыбіні, бязмерна багатая ў сваіх праяўленнях. Ды і талент прырода наразае не роўнымі порцыямі. У гэтым прычына недасканаласці нашых твораў. Аглянешся вось так на пройдзены шлях, асабліва калі ён вымяраецца не адным дзесяткам гадоў, і выразна бачыш: не ўсё зроблена, што можна было зрабіць, а сёе-тое не шкодзіла б і нанова перарабіць.

Пры ўсіх акалічнасцях у пісьменніка заўсёды ёсць верны арыенцір — народ і яго велічныя справы. Якімі б складанымі сцежкамі ні прыходзілася ісці пісьменніку, думы аб лёсе народа, клопаты аб яго шчасці прывядуць яго на правільны шлях.

У заключэнне К. Крапіва сказаў:

— Я чуў сёння шмат шчырых і добрых пажаданняў, якія вельмі хацеў бы выканаць: і пражыць сто гадоў, і напісаць шмат выдатных твораў. На жаль, ёсць акалічнасці, незалежныя ад нас, якія абмяжоўваюць нашы жаданні і нашы магчымасці. І я не хацеў бы апынуцца ў ролі тых людзей, якія ў пачатку года, для паказухі, бяруць празмерныя абавязацельствы, а пасля хаваюцца ў кусты. Але я абяцаю, што ваш наказ, наколькі мне хопіць здароўя і сілы, буду выконваць добрасумленна.

Заключным падарункам юбіляру і ўсім прысутным быў спектакль «Хто смяецца апошнім», у якім былі заняты даўнія сябры творчасці Кандрата Кандратавіча народныя артысты СССР Л. Ржэцкая, Г. Глебаў, Б. Платонаў, народныя артысты БССР Л. Рахленка, В. Пола і інш.

XXVI З'ЕЗД КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

4 і 5 сакавіка XXVI з'езд КПБ працягваў сваю работу.

На ранішнім пасяджэнні 4 сакавіка дэлегаты абмяркоўвалі справаздачныя даклады ЦК КП Беларусі і Рэвізійнай камісіі КП Беларусі.

У спрэчках выступілі тт. **А. І. Белякова** — старшыня выканкома Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, **В. І. Казлоў** — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, **У. А. Мікуліч** — першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ, **П. У. Броўка** — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, **Л. П. Мятліцкі** — першы сакратар Мінскага гаркома КПБ, **С. С. Марахін** — камандуючы Беларускай ваеннай акругай, **У. Б. Труноў** — сакратар Віцебскага абкома КПБ **Г. М. Жабіцкі** — першы сакратар ЦК ЛКСМБ, **У. А. Ралько** — старшыня калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна, **І. М. Макараў** — старшыня Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў, **В. І. Пятроў** — старшыня Камітэта дзяржбяспекі пры Савеце Міністраў БССР.

На ранішнім пасяджэнні быў таксама заслуханы даклад старшыні Мандатнай камісіі з'езда тав. **М. І. Лагіра**.

На вячэрнім пасяджэнні ў спрэчках па справаздачных дакладах ЦК КПБ і Рэвізійнай камісіі КП Беларусі выступілі тт. **В. Ф. Языковіч** — першы сакратар Гомельскага абкома КПБ, **А. А. Смірноў** — старшыня Камітэта народнага кантролю БССР, **Т. А. Лагунова** — дырэктар саўгаса «Бальшавік» Мінскага раёна, **В. Ф. Купрэвіч** — прэзідэнт Акадэміі навук БССР, **А. І. Слабада** — першы сакратар Любанскага райкома КПБ, **У. Е. Лабанок**— першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, **А. Ф. Ільіч** — сакратар парткома Беларускага аўтазавода, **С. Г. Скарапанаў** — міністр сельскай гаспадаркі БССР.

З заключным словам выступіў першы сакратар ЦК КП Беларусі тав. **П. М. Машэраў**.

Па справаздачнаму дакладу ЦК КПБ з'езд аднагалосна прыняў рэзалюцыю.

5 сакавіка на ранішнім пасяджэнні XXVI з'езда Камуністычнай партыі Беларусі з дакладам «Праект Дырэктыў XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966—1970 гады» выступіў Старшыня Савета Міністраў БССР тав. **Ц. Я. Кісялёў**.

У спрэчках па дакладу выступілі тт. **В. А. Ражкоў**—дырэктар Мінскага маторнага завода, **І. М. Жыжаль**—міністр будаўніцтва БССР, **К. П. Арлоўскі** — старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна, **Д. В. Цябут** — старшыня выканкома Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, **А. В. Аляксанкін** — міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР, **М. П. Малочка** — старшыня выканкома Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, **А. Н. Сеўчанка** — рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, **В. Л. Калоша** — звеннявая калгаса «Сцяг Леніна» Карэліцкага раёна, **М. А. Кліменка** — старшыня выканкома Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, **Ф. М. Іваноў** — сакратар Магілёўскага абкома КПБ, **П. Я. Рубіс** — старшыня выканкома Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

Па дакладу тав. Ц. Я. Кісялёва з'езд аднагалосна прымае пастанову.

Затым з'езд пераходзіць да выбараў Цэнтральнага Камітэта КПБ і Рэвізійнай камісіі КПБ. Закрытым (тайным) галасаваннем выбіраюцца члены і кандыдаты ў члены Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі і Рэвізійная камісія КП Беларусі.

Парадак дня вычарпан. Тав. **П. М. Машэраў** аб'яўляе XXVI з'езд Камуністычнай партыі Беларусі закрытым.

5 сакавіка г.г. адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, выбранага XXVI з'ездам КПБ.

Пленум выбраў Прэзідыум ЦК КП Беларусі ў наступным саставе.

Члены Прэзідыума ЦК КПБ:

Казлоў В. І., Кісялёў Ц. Я., Лабанок У. Е., Макараў І. М., Машэраў П. М., Палякоў І. Я., Пілатовіч С. А., Прытыцкі С. О., Смірноў А. А., Сурганаў Ф. А., Філімонаў Д. Ф.

Кандыдаты ў члены Прэзідыума ЦК КПБ:

Жабіцкі Г. М., Марахін С. С.

Пленум выбраў сакратарыят ЦК КПБ. Першым сакратаром ЦК КПБ выбран тав. **Машэраў П. М.**, другім сакратаром выбран тав. **Сурганаў Ф. А.**, сакратарамі ЦК КПБ выбраны тт. **Прытыцкі С. О., Філімонаў Д. Ф., Пілатовіч С. А.**

Пленум зацвердзіў загадчыкаў аддзелаў ЦК КПБ:

прапаганды і агітацыі — тав. **Кузьміна А. Т.**; арганізацыйна-партыйнай работы—тав. **Полазава М. Н.**; навукі і навучальных устаноў — тав. **Капіча М. Ф.**; культуры—тав. **Марцалева С. В.**; цяжкай прамысловасці і транспарту — тав. **Мікуловіча Я. А.**; хімічнай і лёгкай прамысловасці — тав. **Нагібовіча Л. М.**; харчовай прамысловасці — тав. **Адамовіча П. С.**; будаўніцтва і гарадской гаспадаркі — тав. **Колакалава Ю. Б.**; сельскагаспадарчага — тав. **Баўрына В. І.**; гандлю і бытавога абслугоўвання — тав. **Яўцешына В. К.**; адміністрацыйных органаў — тав. **Кляцкова Л. Г.**. Старшынёй Парткамісіі пры ЦК КПБ зацверджан тав. **Каралёў Р. Я.**; кіраўніком спраў ЦК КПБ — тав. **Фадзееў А. Р.**

Пленум зацвердзіў рэдактарамі газет «Звязда» — тав. **Пыжкова В. А.**, «Сельской газеты» — тав. **Зініна А. К.**, «Советская Белоруссия» — тав. **Качана Я. І.**, часопіса «Коммунист Белоруссии» — тав. **Мацвеева У. В.**

5 сакавіка г. г. адбылося пасяджэнне Рэвізійнай камісіі КП Беларусі. Старшынёй Рэвізійнай камісіі выбран тав. **Кожар І. П.**



У гэтым прасторным цэху са спецыяльнай сістэмай асвятлення і вентыляцыі вырабляюцца дываны. Тое, што каштавала некалі доўгіх месяцаў знясільваючай працы, такой машынай тчэцца за адну гадзіну.

Валянціна Мар'янкова і Людміла Кандрацьева — з ліку лепшых работніц Брэсцкага дыванавага камбіната. Як бачыце, яны гэтак жа не падобны на колішніх рабынь-дываноўшчыц, як іх прадпрыемства—на старажытныя саматужныя дывановыя майстэрні.

Фота Ю. ІВАНОВА.

На здымку: сустрэча ў Маскве. Гасцей з Беларусі вітае народны артыст СССР М. І. ЦАРОЎ.

БЕЛАРУСЬ—РАСІЯ—ДРУЖБА

ПОЕЗД З УДЗЕЛЬНІКАМІ ФЕСТЫВАЛЮ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў РСФСР РУШЫЎ У ДАРОГУ ⊙ УРАЧЫСТАЯ СУСТРЭЧА Ў МАСКВЕ ⊙ НАПЕРАДЗЕ — КЕМЕРАВА.

На шыльдачках вагонаў гэтага поезда замест назваў гарадоў стаіць слова «Беларусь». На вокнах каляровай крэйдай выведзена: «Фестываль», «Дружба».

«Дружба» — так называецца спецыяльны поезд, якім уначы з пятага на шостае сакавіка накіраваліся ў Сібір удзельнікі фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР.

500 музыкантаў, танцораў, спевакоў вязе поезд. У далёкую дарогу рушылі Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР, Дзяржаўны народны аркестр БССР, Дзяржаўны ансамбль танца БССР, Дзяржаўны народны хор БССР, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР, эстрадны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання.

На вуліцах сібірскіх і уральскіх гарадоў і сёл хутка з'явяцца афішы не толькі гэтых калектываў. Састаў вязе эстрадныя групы Беларускай дзяржаўнай філармоніі з удзелам заслужаных артыстаў БССР Р. Дзідзенкі і М. Шышкіна, спевака Э. Міцуля. З сольнымі канцэртамі выступяць на фестывалі народныя артысткі СССР Н. Ткачэнка і Т. Ніжнікава, народныя артысты БССР І. Сарокін, Т. Шымко, В. Чарнабаеў, заслужаны артыст БССР А. Саўчанка. Народны артыст БССР З. Бабій будзе выступаць з Народным аркестрам БССР, а заслужаныя артысты БССР Е. Эфрон і лаўрэат Міжнароднага конкурсу В. Шацкі — з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР. Са сваёй афішай едуць на фестываль чытальнікі — лаўрэат рэспубліканскага конкурсу Р. Пятрэнка, дыпламант Усесаюзнага конкурсу В. Спіткоўская і М. Зорын.

Беларускіх кампазітараў будуць прадстаўляць на фестывалі аўтары папулярных твораў Ул. Алоўнікаў, Ю. Семяняка, Д. Камінскі, Л. Абеліёвіч. У Кемераве ўжо разгортваецца выстаўка беларускага выяўленчага мастацтва. На ёй больш 120 твораў 73-х нашых жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Такая ж выстаўка хутка адкрыецца ў Новасібірску. На сустрэчу з працоўнымі Сібіры і Урала едуць старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стальмашонак і сакратар праўлення В. Грамыка. Пазней да іх далучацца народныя мастакі БССР І. Ахрэмчык і А. Бембель.

Нашы кінематаграфісты адкрыюць фестываль новым мастацкім фільмам «Альпійская балада». У сустрэчах з гледачамі прымуць удзел рэжысёр-пастаноўшчык фільма Б. Сцяпанаў, аператар А. Забалоцкі, артысткі Л. Румянцава і Н. Казлоўская. У «кінапукэ» едуць і прадстаўнікі студыі хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў Я. Сакалоў і Ул. Пужэвіч. Яны будуць здымаць фільм, прысвечаны фестывалю.

З Кузбаса, дзе 10 сакавіка афіцыйна адкрыецца фестываль, прыйшло першае паведамленне. Кемераўскае радыё пачало свае перадачы пазыўнымі Мінскай станцыі і выкананнем Гімна БССР. Беларускія радыёжурналісты накіравалі сваім сібірскім калегам спецыяльную праграму перадач, прысвечаную роднай рэспубліцы. Яна гучыць у эфіры вось ужо пяты дзень. Перадачы, прысвечаныя Беларусі, паказвае Кемераўскае тэлебачанне.

Кемераўцы першыя ў Сібіры пазнаёмяцца з мастацтвам нашай рэспублікі. Потым поезд вяртаецца назад — бярэ дарогу на Новасібірск, Омск, Свярдлоўск.

А пакуль колы адлічваюць першыя сотні кіламетраў. І вось ужо Масква, сэрца нашай Радзімы, сталіца Расійскай Федэрацыі.

Беларускі вакзал сталіцы. Сюды ў 14 гадзін 15 мінут падышоў фестывальны поезд. Адразу да вагонаў спяшаюцца людзі з кветкамі. Пацалункі, абдымкі, моцныя поціскі рук.

Сустрэць беларускіх гасцей прыбылі загадчык аддзела культуры ЦК КПСС В. Шаура, намеснік Старшыні Савета Міністраў РСФСР В. Дзякаў, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС па РСФСР М. Халдзееў, сакратар Маскоўскага гарадскога камітэта партыі Г. Шапашнікава, старшыня прэзідыума Усерасійскага тэатральнага таварыства, народны артыст СССР М. Цароў і многія іншыя грамадскія і партыйныя дзеячы, артысты, работнікі культуры.

Пачынаецца мітынг. Яго адкрывае намеснік Старшыні Савета Міністраў РСФСР В. Дзякаў. Гучаць гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР.

— Вас усюды будуць сустракаць як самых лепшых сяброў,— гаворыць Міхаіл Цароў.— Прасторы Расіі адкрыты перад вамі, як і нашы сэрцы.

— Мы любім мастацтва вялікага беларускага народа,— гаворыць сакратар МГК КПСС Г. Шапашнікава.— Прыезд беларускіх артыстаў заўсёды для нас свята. А гэтай сустрэчы мы рады асабліва, бо яна не мае роўных сабе ні па маштабах, ні па колькасці ўдзельнікаў.

Са словамі падзякі да рускага народа і рускай зямлі выступае міністр культуры БССР М. Мінковіч. Мітынг закончаны. Беларускія госці трапляюць у «абдымкі» карэспандэнтаў. Даюць інтэрв'ю народны артыст БССР З. Бабій, заслужаны артыст УССР і заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Апанасенка; дзяўчат з ансамбля танца, Дзяржаўнага народнага хору здымаюць маляўнічымі групамі. Здымкі на ўспамін робяць шматлікія аматары.

У Маскве поезд стаяў некалькі гадзін. Удзельнікаў фестывалю запрасілі ў Цэнтральны Дом работнікаў мастацтва на прагляд спецыяльнай кінапраграмы, а ўвечары «Дружба» рушыла ў дарогу. Наперадзе—Кемерава.

М. МАРЦІНКОЎСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

XXIII

ЧЫТАЮЧЫ ПРАЕКТ ДЫРЭКТЫЎ...

У СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ ВЯЛІКАЯ БУДУЧЫНЯ

А. РАКОВІЧ,
аспірант Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

ПАВОДЛЕ праекта Дырэктыў XXIII з'езда партыі па новай пяцігодцы прадугледжваецца далейшае развіццё сеткі ўстаноў культуры і мастацтва, выдавецкай справы і паліграфічнай прамысловасці. Тыраж кніг за пяцігоддзе павялічыцца прыкладна на 25 працэнтаў. Гэта ставіць перад кнігагандлёвымі арганізацыямі новыя адказныя задачы — давесці кнігу да кожнага жыхара горада і вёскі. Немалую ролю ў гэтым павінна адыграць спецыялізацыя ў кнігагандлёвай справе.

Вопыт работы спецыялізаваных кніжных магазінаў у вялікіх гарадах краіны пераканаўча паказаў іх перавагу перад універсальнымі кнігарнямі.

Работнікі такіх магазінаў маюць магчымасць глыбей вывучаць попыт пакупнікоў, даваць больш кваліфікаваныя заказы на кнігі, лепш арганізоўваць прапаганду і рэкламу літаратуры, як правіла, яны больш падрыхтаваныя і лепш ведаюць адпаведныя раздзелы літаратуры. Спецыялізацыя кнігарань дазваляе хутчэй укараняць усё новае, перадавое, што нараджаецца ў кнігагандлёвай практыцы. Нарэшце, усё гэта спрыяе павышэнню культуры кніжнага гандлю.

У нашай рэспубліцы сёння працуе 19 спецыялізаваных і 17 прафіляваных магазінаў. На жаль, трэба сказаць, што сетка такіх кнігарань расце ў Беларусі вельмі марудна. Асабліва гэта датычыць Мінскага, Магілёўскага і Віцебскага аблкнігагандляў.

Заслугоўвае ўвагі вопыт работы Брэсцкага аблкнігагандлю (дырэктар А. Кірылін). З 12 кнігарань, якія працуюць у сістэме аблкнігагандлю, — дзевяць спецыялізаваных, з іх сем знаходзяцца ў Брэсце. Тут працуюць магазіны палітычнай кнігі, навукова-тэхнічнай літаратуры, падпісных выданняў, кнігі краін народнай дэмакратыі, літаратуры па мастацтву, падручнікаў і вучэбна-метадычнай літаратуры, кнігарня пазамагазінных форм гандлю. У Баранавічах і Пінску адкрыта па адным спецыялізаваным магазіне па продажу падручнікаў і вучэбна-метадычнай літаратуры.

Спецыялізацыя кнігарань у Брэсце і вобласці дала магчымасць палепшыць вывучэнне попыту пакупнікоў на літаратуру, прапаганду і распаўсюджванне кніг сярод насельніцтва. Значна павялічыўся продаж кніг і іншай друкаванай прадукцыі ў розніцу. У 1963 годзе на душу насельніцтва прадавалася кніг на 3 руб. 20 кап., у 1964 годзе — на 3 руб. 60 кап., а летась было прададзена кніг на аднаго чалавека ў сярэднім на 4 руб. 7 кап.

У кніжных магазінах вобласці створаны саветы садзеяння прапагандзе і распаўсюджанню літаратуры. 120 прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў, навучальных устаноў, навуковых і культурна-асветных устаноў пастаянна памагаюць работнікам магазінаў складаць заказы на літаратуру, прапагандаваць кнігі і распаўсюджваць іх.

Спецыялізаванымі кнігарнямі больш паспяхова выконваецца план продажу кніг. У 1964 годзе аблкнігагандаль выканаў план распаўсюджання літаратуры на 101 працэнт і рэалізаваў кніг на 40 тысяч рублёў больш, чым у 1963 годзе. За мінулы год было прададзена рознай літаратуры на 56 тысяч рублёў больш, чым у папярэднім годзе. Павялічыўся продаж грамадска-палітычнай, вучэбна-метадычнай, навукова-тэхнічнай і іншай літаратуры.

Магазін «Палітычная кніга» прадаў у 1965 годзе сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай літаратуры на 2 100 рублёў больш, чым у 1964 годзе. Гэты магазін карыстаецца папулярнасцю ў жыхароў горада. Добрая арганізацыя работы, улік патрэб кожнага пакупніка, умелая прапаганда кнігі — усё гэта ўласціва работнікам магазіна, якому прысвоена ганаровае званне калектыву камуністычнай працы (дырэктар Л. Абрамава). Варта адзначыць, што памяшканне кнігарні не вельмі добрае для рэкламы, а таксама для размяшчэння асартыменту кніг. Але прадаўцы здолелі перамагчы і гэты недахоп. Кнігі расстаўлены так, што, прыйшоўшы ў магазін, пакупнік хутка знаходзіць патрэбную літаратуру, а калі часам сам не справіцца, дык на дапамогу яму прыходзіць прадавец. У гандлёвай зале ёсць больш 20 добра афармленых кніжных вітрын на тэмы: «Партыя—наш рулявы», «Кнігі пра Ул. І. Леніна», «Для прапагандыстаў і агітатараў», «У дапамогу тым, хто вывучае палітэканомію», «Кнігі па атэізму», «Каланіялізму няма месца на зямлі!», «Бібліятэка сакратара парторганізацыі», «Бібліятэка «Героі і подзвіг» і інш. Прапагандысты, агітатары, слухачы сеткі партыйнай асветы, студэнты заўсёды жаданыя госці гэтай кнігарні. Работнікаў магазіна заўсёды ўбачыш за кніжным столікам на розных канферэнцыях, семінарах, ва універсітэтах культуры. Летась магазін арганізаваў 72 выезды з кнігай на прадпрыемствы горада. Было распаўсюджана грамадска-палітычнай літаратуры на 2200 рублёў.

Вялікую дапамогу аказваюць магазіну 62 грамадскія распаўсюджвальнікі 30 камсамольскіх арганізацый горада. Летась яны прадалі рознай літаратуры больш як на дзве тысячы рублёў. А калі іншагароднюму пакупніку спатрэбіцца палітычная літаратура, дык заўсёды яму на дапамогу прыйдзе аддзел «Кніга — поштай» гэтага магазіна.

Не меншай папулярнасцю ў насельніцтва Брэста карыстаецца магазін «Навукова-тэхнічная кніга». Яго калектыў падтрымлівае актыўную сувязь з прамысловымі прадпрыемствамі, навучальнымі ўстановамі, калгасамі і саўгасамі. Ні адзін спецыяліст сельскай гаспадаркі, будучы ў камандзіроўцы ў Брэсце, не паедзе дахаты, не зайшоўшы ў гэты магазін, і з пустымі рукамі адсюль не пойдзе, абавязкова павязе з сабою некалькі патрэбных яму кніг.

Абслугоўваюць у гэтым магазіне пакупніка культурна, ветліва і з веданнем справы. Шмат гадоў працуюць у кніжным гандлі загадчык магазіна Л. Берштэйн і старшы прадавец Н. Бяспалава. Магазін на працягу некалькіх год перавыконвае планы продажу кніг.

Да нядаўняга часу ў магазіне існаваў аддзел падпісных выданняў. Была ў асартыменце і нотна-музычная літаратуры. У 1964 годзе музычную літаратуру перадалі спецыялізаванаму магазіну «Мастацтва», а ў 1965 годзе на базе аддзела падпісных выданняў быў адкрыты спецыялізаваны магазін. Работнікі «Навукова-тэхнічнай кнігі» занепакоіліся, ці будуць наведваць кнігарню пакупнікі. Але трывога была дарэмная. Калектыў панаў аддаваць больш увагі прапагандзе навукова-тэхнічнай літаратуры, быў выдзелены спецыяльны аддзел сельскагаспадарчай кнігі. Усё гэта дало добрыя вынікі. За 1964—1965 гады продаж навукова-тэхнічнай літаратуры павялічыўся на 15 працэнтаў. Шмат памагаюць работнікам магазіна грамадскія распаўсюджвальнікі, якіх вылучана 25 камсамольскімі арганізацыямі горада больш за 60 чалавек. Апроч таго, ад магазіна ўжо некалькі гадоў працуюць шэсць народных кніжных кіёскаў. З 1961 года добра працуе народны кіёск на дывановым камбінаце. Да 12 працэнтаў агульнага выканання плана прыпадае на пазамагазінныя формы гандлю.

У магазіне пакупнік можа даведацца пра выхад з друку кнігі, атрымаць кваліфікаваную даведку або кансультацыю аб новай літаратуры, зробіць заказ на кнігу.

Вялікая дружба звязвае калектыў магазін з саветам садзеяння прапагандзе і распаўсюджванню літаратуры, які ўзначальвае інжынер В. Пацехін.

Калектыў магазіна неаднаразова выходзіў пераможцам у конкурсах і аглядах. Ля ўваходу ў магазін на маляўніча афармленым стэндзе сабраны дыпломы і граматы, якія атрымалі за старанную працу работнікі кнігарні. Апошнюю ўзнагароду калектыў атрымаў у 1964 годзе як пераможца ва Усесаюзным конкурсе на лепшую кнігарню. У 1963 годзе магазіну прысвоена высокае званне калектыву камуністычнай працы.

Не менш цікавая работа другой кнігарні, названай крыху незвычайна — «Магазін пазамагазіннага гандлю», якая аб'ядноўвае адзінаццаць кіёскаў і пяць столікаў у прадуктовых магазінах. Тут бяруць літаратуру чыгуначныя праваднікі і прадаўцы трох прамтаварных магазінаў. Новая спецыялізаваная кнігарня з кожным годам паляпшае сваю работу, павялічвае продаж літаратуры насельніцтву. У 1964 годзе магазін праз сваю сетку рэалізаваў кніг на 83,8 тысячы рублёў, а ў 1965 годзе — выручка склала амаль сто тысяч рублёў.

У 1964 годзе ў Брэсце адкрыўся новы, добра абсталяваны магазін «Мастацтва». Да адкрыцця гэтай кнігарні выяўленчую прадукцыю і нотна-музычную літаратуру прадавалі ўсе магазіны горада, сярэднегадавая выручка ад продажу яе складала не больш 22 тысяч рублёў. Летась было распаўсюджана кніг, альбомаў і іншай друкаванай прадукцыі на 26,7 тысячы рублёў. Магазін знаходзіцца не на «бойкім» месцы, аднак пакупнікоў тут заўсёды многа. Але, на жаль, асартымент тавараў у гэтай спецыялізаванай кнігарні надзвычай бедны, а попыт на выяўленчую прадукцыю вялікі і не задавальняецца магазінам.

Ні адно мерапрыемства аблкнігагандлю не праходзіць без актыўнага ўдзелу грамадскіх прапагандыстаў кнігі (іх тут 400 чалавек). Гэтая вялікая армія людзей розных спецыяльнасцей летась прадала рознай літаратуры на суму больш васьмі тысяч рублёў. 127 камсамольскіх арганізацый, 14 народных кніжных кіёскаў пастаянна распаўсюджваюць кнігу. За мінулы год сіламі грамадскасці па аблкнігагандлю рэалізавана кніжнай і іншай друкаванай прадукцыі больш чым на 22,3 тысячы рублёў.

У спецыялізаваных кнігарнях Брэста ёсць сталы папярэдніх заказаў на кнігі. Кнігі шырока прапагандуюцца і рэкламуюцца праз спецыяльныя праспекты, лістоўкі, закладкі і інш., а таксама па радыё, тэлебачанні, праз мясцовы друк. Часта па радыё і тэлебачанні выступаюць работнікі кніжных магазінаў. Па абласным радыё перадаюцца магнітафонныя запісы-анатацыі на новыя кнігі, рабоце лепшых распаўсюджвальнікаў літаратуры прысвячаюцца спецыяльныя перадачы.

Аблкнігагандаль падтрымлівае цесную сувязь з выдавецтвамі рэспублікі. Па яго запрашэнню ў 1964—1965 гадах прадстаўнікі выдавецтваў «Беларусь», «Навука і тэхніка» і «Ураджай» выязджалі ў Брэст, дзе разам з кнігагандлёвымі работнікамі абмяркоўвалі тэматычныя планы выдавецтваў.

Часта наладжваюцца сустрэчы беларускіх пісьменнікаў з пакупнікамі і работнікамі кніжнага гандлю ў кніжных магазінах, на прадпрыемствах, у навучальных установах. Работнікі магазінаў у час сустрэч арганізоўвалі продаж кніг, а пісьменнікі даволі аўтографы.

Актыўную работу па паляпшэнню прапаганды і распаўсюджванню літаратуры праводзіць савет навукова-тэхнічнага таварыства паліграфіі і выдавецтва Упраўлення па друку (старшыня Я. Розбаш). У вобласці штогод праводзіцца конкурс на лепшы кніжны кіёск, а ў мінулым годзе адбыўся конкурс на лепшую рэкламу кнігі. Пераможцамі гэтага конкурсу былі прызнаны брэсцкія магазіны №№ 1, 3 і 7 і магазін № 6 у Баранавічах. Для абмену вопытам работы ў 1964—1965 гадах былі арганізаваны чатыры паездкі прадаўцоў магазінаў на Украіну.

Ва Усесаюзным конкурсе за лепшы кнігагандаль па спецыялізацыі і прафілізацыі кніжных магазінаў Брэсцкі аблкнігагандаль атрымаў дыплом і трэцюю грашовую прэмію.

Добрых вынікаў у распаўсюджванні літаратуры дамагліся спецыялізаваныя магазіны і іншыя аблкнігагандляў рэспублікі. Так, мінскі магазін «Навукова-тэхнічная кніга» за пяць гадоў работы павялічыў рэалізацыю навукова-тэхнічнай літаратуры на 30 працэнтаў, хоць акрамя гэтай кнігарні распаўсюджваннем тэхнічнай кнігі займаюцца і іншыя кнігагандлёвыя прадпрыемствы сталіцы.

З усяго сказанага вышэй трэба зрабіць вывад аб неабходнасці спецыялізацыі.

Упраўленне кніжнага гандлю склала план спецыялізацыі і прафілізацыі кніжных магазінаў у рэспубліцы на некалькі гадоў. Гэты план зацверджаны Камітэтам па друку пры Савеце Міністраў БССР. Але выконваецца ён яшчэ вельмі марудна. Справа ў тым, што выканкомы мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных не вельмі ахвотна выдзяляюць памяшканні для новых кнігарань у гарадах рэспублікі. Асабліва гэта датычыцца гарвыканкомаў Мінска, Магілёва, Віцебска, Бабруйска, Гродна, Маладзечна. Нельга мірыцца з такім становішчам, калі сёння ў Мінску і ў абласных цэнтрах (апроч Брэста) няма магазінаў палітычнай кнігі.

У спецыялізацыі — вялікая будучыня. Яна, несумненна, акажа спрыяльны ўплыў на ўсю работу кнігагандлёвых прадпрыемстваў і дасць магчымасць узняць на новы ўзровень кніжны гандаль у рэспубліцы.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

АДНА З ДЫНАСТЫІ

Кароткае газетнае паведамленне: на гастролі ў Італію выехала група вядучых артыстаў савецкага цырка і сярод іх дрэсіроўшчыца Антаніна Польдзі з Беларускага цыркавога калектыву. Гэта было год назад. Быць прадстаўніком савецкага мастацтва за рубяжом — справа адказная і ганаровая. Я прыгадваю выступленні А. Польдзі да ўтварэння Беларускага калектыву, яе работу ў калектыве, прыгадваю прыгожую жанчыну са сваімі паслухмянымі чацвераногамі выканаўцамі на манежы ў час шматлікіх рэпетыцый, і ні секунды не сумняваюся — выбар зроблены правільна. У высокім майстэрстве артысткі — лепшыя рысы савецкага цырка.

...Яна не просіць мужа дастаць для яе залатую рыбку. Яна жанчына сучасная і ў казачную рыбку не верыць. Ёй і рэчы трэба дарыць модныя і сучасныя — муж гэта разумее. Ён вельмі ганарыцца сваёй «ластаўкай» — прыгажуняй-жонкай, і няма нічога дзіўнага ў тым, што ён робіць для яе амаль немагчымае — дастае дзесьці новенькі апарат для завіўкі валасоў.

Ах, як яна рада, як кахае яна цяпер свайго старэнькага прафесара! Такога цуда-апарата няма ні ў кога з яе знаёмых, яна зноў здзівіць усіх!

Яна торкае галаву ў апарат — раз, два — гатова! У яе незвычайная прычоска! І раптам — о жах! — камяк валасоў адвальваецца, з'яўляецца лысіна... Муж сваім нягодным апаратам знявечыў яе. Гэтага яна яму не дарае!

— Пайду да першага мужа! — высакамерна кідае яна прафесару.

І ідзе.

Гэтую сцэнку, якую паказвае Беларускі цыркавы калектыў, ведаюць мільёны савецкіх гледачоў. Ролю прафесара ў ёй выконвае заслужаны артыст БССР Анатоль Шаг, яго жонку іграе Антаніна Польдзі. Артысты не абмяжоўваюцца паказам арыгінальных ілюзійных трукаў, сваю задачу яны разумеюць значна шырэй. Яны выкрываюць абмежаванасць, мяшчанства і вузкасць яго погляду. Жонка прафесара — нікчэмнасць, і гэтага не ўтойвае артыстка. Яна бязлітасная да сваёй гераіні, і хоць ёю не сказана ніводнага выкрываўчага слова — гледачу ўсё зразумела.

Удзел у ілюзійным атракцыёне раскрыў новы бок таленту А. Польдзі, таленту вострага і публіцыстычнага.

Але гэта, так сказаць, другая прафесія артысткі. З асноўнай жа яе работай гледачы знаёмяцца ў першым аддзяленні праграмы.

...У маленстве А. Польдзі марыла пра балетную сцэну. Скончыла харэаграфічнае вучылішча, і, магчыма, я расказваў бы сёння пра таленавітую салістку балета, калі б... Зрэшты, нічога нечаканага не адбылося — Антаніна стала жонкаю артыста цырка Мікалая Польдзі. І я ўпэўнены, што іменна ў цырку па-сапраўднаму раскрыўся яе талент.

Спачатку яна працавала ў нумары «Жанглёры на манацыклах» (аднакалёсных веласіпедах) пад кіраўніцтвам свайго мужа. Надзвычайная лёгкасць і пластычнасць яе работы, безумоўна, упрыгожвалі гэты цікавы і цяжкі нумар. Але здарылася няшчасце — артыстка атрымала траўму. Пакінуць цырк яна ўжо не магла, відаць, праўду гавораць: хто хоць раз выйшаў на манеж, не пакіне яго ніколі. Вярнуцца ж да ранейшага нумара ёй пакуль што забаранялі ўрачы.

І А. Польдзі стала дрэсіроўшчыцаю сабачак — так было вырашана на сямейным савеце.

Дрэсіроўка — адзін з самых старажытных жанраў цыркавога мастацтва. У гэтым жанры працавала і працуе шмат выдатных майстроў. Здавалася, нічога новага вынайсці тут нельга, асабліва ў рабоце з сабачкамі. Іншай думкі была Антаніна. Першыя ж яе выступленні паказалі, што ў савецкім цырку з'явілася здольная дрэсіроўшчыца. Праўда, спачатку яе чацвераногія выхаванцы рабілі тое ж, што і сабачкі ў іншых цумарах — скакалі праз кольцы і цераз бар'ерчыкі. Хадзілі на задніх лапках. Але нават гэтая традыцыйная работа вызначалася сваёй жвавасцю, свабодай і весялосцю. Ды і работаю гэта можна было назваць толькі ўмоўна. Работа была на рэпетыцыях, а ў час паказаў артыстка гуляла са сваімі сабачкамі, разам з гледачамі любавалася імі, заахвочвала або дакарала іх. Дрэсіроўшчыца ні секунды не стаіць на месцы — вось дзе спатрэбілася захапленне балетам. І кожны яе рух канцэнтруе ўвагу гледачоў на трыках, якія выконваюцца сабачкамі.

З кожным годам у А. Польдзі папаўняецца арсенал трукаў. Шмат памагае ёй у гэтых адносінах Мікалай Польдзі, нястомны вынаходнік, майстар на ўсе рукі. Сёння сабачкі лётаюць у ракеце — бо яны сваякі славутых Белкі і Стрэлкі: скачуць цераз бар'ерчыкі на стале, які круціцца з вялікай хуткасцю; ходзяць калонаю адзін за адным; круцяць сальта, як сапраўдныя акрабаты. А славутая тройка? Артыстка здолела прымірыць спрадвечных ворагаў — сабаку і кошку, і яны паважна і мірна сядзяць у тачанцы, якую імчыць па кругу тройка сабачак. А кошка, якая едзе верхам на сабаку па бар'еры?

Нумар А. Польдзі можа ўпрыгожыць любую цыркавую праграму. Савецкі цырк гастраліраваў у Францыі, і шмат захопленых водгукаў самых патрабавальных крытыкаў было прысвечана рабоце Антаніны Польдзі.

Праца артысткі — штодзённая і напружаная — нараджае новыя нумары і трукі.

...Шмат гадоў цыркавой дынастыі Польдзі. І кожны член гэтай слаўнай сям'і — майстар высокага класа.

Д. РАДЗІНСКІ.

У маладзечанскіх мастакоў

Маладзечанскі міжраённы Дом народнай творчасці наладзіў мастацкую выстаўку твораў жывапісу, графікі, скульптуры. Свае работы паказалі мастакі горада Маладзечна тт. Асановіч, Герасіменка, Кісель, Крачноўскі і іншыя.

Акрамя жыхароў горада, на выстаўцы пабывала шмат наведвальнікаў з Вілейскага, Мядзельскага і Валожынскага раёнаў.

М. ЛАЗАР.

СПЕКТАКЛЬ—ЭКЗАМЕН

Гарачыя цяпер дні ў навучэнцаў трэцяга курса Гродзенскага культасветвучылішча — экзаменацыйных спектаклі. І вось юнакі і дзяўчаты садзяцца за грымівальныя столікі. Выкладчык тэхнікі сцэны І. Шэвалье паказвае ім, як зрабіць дэкарацыі сквера, пакоя, чырвонага кутка ў інтэрнаце. Самі навучэнцы рыхтуюць таксама касцюмы, грымы.

...Адкрываецца заслона. Ідзе пастаноўка Л. Сінельнікава «Малінавы звон». Усіх хвалюе ігра С. Шапавалава, які добра перадаў драму студэнта Андрэя. Удала выканалі свае ролі А. Акімава, Т. Чопчыц, А. Сайко. Акрамя таго, навучэнцы выконвалі абавязкі памочніка рэжысёра, асвятляльніка, электрыка, рабочага сцэны. Экзаменацыйны спектакль прайшоў паспяхова.

Д. ШАПІРА.

КУТОК РОДНАГА КРАЮ

У Івянецкай бібліятэцы Валожынскага раёна арганізаваны куток «Любі і вывучай свой край». Тут выстаўлены кнігі, прысвечаныя Ф. Э. Дзяржынскаму, а таксама М. В. Фрунзе, які ў маі 1916 года жыў у Івянцы. Наведвальнікі з цікавасцю разглядаюць фотаальбомы «Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Мінскай вобласці» і «Людзі нашага раёна». У кутку сабрана шмат матэрыялаў аб жывёльным і раслінным свеце Налібоцкай пушчы, з гісторыі гарадскога пасёлка.

Я. МАКОУСКІ.

ГЕРОІ ПОБАЧ

Ганну Іосіфаўну Заянкоўскую ведаюць у калгасе, як добрую працаўніцу, сціплую жанчыну. А нядаўна хлебаробы ўбачылі яе фотакартку на стэндзе «Яны абаранялі Радзіму». Стэнд абсталяваны ў мясцовым клубе.

У гэтай жанчыны баявое мінулае. У суровыя дні Айчыннай вайны яна была адважнай партызанкай-падрыўніцай. Разам са сваімі баявымі таварышамі пускала пад адхон варожыя эшалоны.

Многа баявых подзвігаў на рахунку Ганны Іосіфаўны. Летась, калі споўнілася дваццаць год з дня Перамогі над фашысцкай Германіяй, яна была ўзнагароджана медалем «За адвагу».

Побач на стэндзе—фотакартка яе мужа Уладзіміра Іванавіча, былога франтавіка, кавалера некалькіх баявых ордэнаў і медаляў. А вось яшчэ некалькі партрэтаў калгаснікаў: Васіля Канановіча, Мацвея Асіповіча, старшыні сельгасарцелі Мікалая Севярына і іншых.

Кожны, хто спыняецца перад стэндам, адчувае пачуццё ўдзячнасці да гэтых простых людзей, якія, не шкадуючы жыцця, баранілі Радзіму ад фашысцкіх захопнікаў.

І. СЦЯПАНАЎ.

Калгас імя Леніна
Маладзечанскага раёна.

Вольга Старасценка, Зоя Аусіевіч і Тамара Калугіна вучацца ў Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горнага. Неразлучныя сяброўкі разам ходзяць на заняткі, разам выступаюць у канцэртах мастацкай самадзейнасці.

Фота П. ЛАСТАЎКІ.

ПЯЕ КАПЭЛА НАСТАЎНІКАЎ

Актавая зала Гродзенскага педінстытута імя Янкі Купалы была перапоўнена. Гледачы з нецярплівасцю чакалі пачатку канцэрта.

І вось рассунулася заслона. На сцэне—хор настаўнікаў горада Гродна на чале з дырыжорам Антонам Валынчыкам. Паліліся гукі песні Мурадэлі «Слава працы». Затым артысты выканалі лірычныя творы Танеева, Расіні, праспявалі песню «А зязюля нукавала», музыку да якой напісаў А. Валынчык.

Да 50-годдзя Савецкай улады васьмігалосая настаўніцкая капэла рыхтуе вялікую праграму.

Мікола ВАДАНОСАЎ

ВЕЧНАЯ праблема

Гумарэска

Ужо колькі год перад святам Восьмага сакавіка на мяне нападае бессань і трашчыць апетыт. «Што рабіць? Што прыдумаць такое незвычайнае, каб хоць раз у жыцці жонка пахваліла?» Больш ляныя і лёгкадумныя мужчыны бяруць з агульнай сямейнай касы грошы і купляюць духі, торты, панчохі. Калі мы толькі пажаніліся, так зрабіў і я. Мая Ліна зусім слушна заўважыла:

— Гэта, Жоржык, не падарунак! Бярэш мае грошы і купляеш мне... Шчыра дзякую!

Калі жонка называе мяне Жоржыкам, мне здаецца, што ў нутро маё залез вожык. Але я стрымліваю злосць і лагодна кажу:

— Але ж, любая мая Лінолія, грошы я ўзяў са сваёй зарплаты!

— З нашай, Жоржык! — паправіла мяне Ліна.— А гэта значыць, і з маёй...

Падумаўшы, я пагадзіўся, што жонка мае рацыю.

На другі год я вырашыў паднесці падарунак сваёй вытворчасці! Набыў тоўстую кнігу карысных парад і на сотай старонцы прачытаў: «Цукровы пясок змяшаць з сырым яйкам, расцерці, дадаць соды, масла, усыпаць муку, замясіць...».

Калі я ў цукар убіў яйка, атрымаўся моцны яхантавы камяк. Ніякія масла і мука не ратавалі. Тады я пачаў выдумляць рэцэпт сам. Першнаперш лінуў вады. Так, на вока. Мука размясілася, а яхантавы камяк яшчэ больш зацвярдзеў. Тады я ўзяў таўкач і пачаў зацята біць непадатлівае цукровае яйка. Пырскі ляцелі ва ўсе бакі — я аж зажмурыўся. А калі расплюшчыў вочы, то ўбачыў, што сцяна, стол і акно залеплены цестам. Але не бяда, калі справа пайшла на лад! Я дадаў яшчэ мукі і малака. Падумаў і разбіў два яйкі. Зноў насыпаў цукру і ўзяўся за таўкач...

Праз тры гадзіны я зразумеў, што замест пясочнага торта атрымалася цагліна. З вялікім жалем я рассек яе на чатыры часткі і выкінуў праз адчыненую фортку на балкон. Тымі кавалкамі падавіўся, пэўна, не адзін верабей...

І ўсё ж Ліна здагадалася аб маёй падпольнай дзейнасці па слядах на сценах і акне.

— Вось бачыш, Жоржык,— зноў са шкадаваннем сказала яна.— Ты сапсаваў муку, яйкі, малако і масла. Адны страты... Няўжо ты ніколі не чытаў пра тое, што атрымлівалася, калі мужчыны браліся за жаночую працу?

Пра гэта я, вядома, чытаў. Але думаў, што ў мяне атрымаецца як след! Я ж набраўся з кніг такіх ведаў!

На другі год заняўся разьбой па дрэве. Вырашыў змайстраваць голуба з галубкай...

Калі жонка прыйшла з цырульні, я сядзеў на канапе з забінтаванымі рукамі і заклееным носам.

— Божа! — усклікнула Ліна, ледзь пераступіўшы парог.—Ты з кватэры зрабіў дрыбнік...

Пра мае фізічныя і душэўныя раны яна не сказала ні слова. Быццам іх зусім не было.

І так было кожны год. То гэта не так, то тое не гэтак. Нарэшце Ліна мяне проста папрасіла:

— Жоржык, не трэба ніякіх падарункаў. А то ты яшчэ ўздумаеш перамыць посуд. Не будзе ў чым есці...

— Што ж мне рабіць?

— Нічога. Проста ў гэты дзень будзем разам. Пойдзем у кіно, у тэатр, да знаёмых...

Ды бунтарская душа мая не змірылася з паражэннямі.

Перад сёлетнім святам я прачытаў каля сотні святочных апавяданняў. Але мне здалося, што ўсе яны безнадзейна ўстарэлі. У іх гаварылася, як няўдалыя мужчыны гатавалі, пяклі, смажылі, як куплялі не тое, што трэба, як разбівалі сабе ілбы, бегаючы ў пошуках падарункаў... І нічога новага, вартага пераймання.

І я зноў пачаў прыдумляць падарункі сам. Спачатку вырашыў прысвяціць жонцы верш і надрукаваць яго хоць у раённай газеце. Першыя радкі даліся лёгка:

Была на гэта важная прычына,
Яе прынёс нам добры сакавік.
П'ю за цябе, шаноўная жанчына,
Мой мужны друг, мой слаўны
працаўнік!..

Больш я не ведаў, як уславіць Ліну. «Можа, зноў падняць чарку за прыгажосць, за пяшчоту, за каханне?» — падумалася мне. Але ў такім разе выходзіла, што свята жаночае, а п'ю адзін я. Атрымлівалася не тое. Паэзія не давалася...

А дні беглі. Да свята заставаўся тыдзень.

І тут...

Неяк ідучы з работы, я спыніўся ля вітрыны магазіна падарункаў. «Прыгожая сумачка — лепшы падарунак!» — прачытаў я і ўспомніў, што ў апошні час мая Ліна некалькі разоў намякала, што ў яе ўжо зусім старая сумачка. Ніяк не выпадае купіць новую. То часу няма, то грошай. Яшчэ жартавала, што час і грошы ніяк не збяруцца разам.

Нагледзеў самую танную — пяць рублёў сорак капеек. Яе я і павінен купіць, не ўзяўшы з дому ні капейкі! У гэтым быў увесь сакрэт. З дому — ні капейкі...

Я падлічыў, як пішуць газетчыкі, свае магчымасці. Калі тыдзень не пакурыць, то на адным «Беларусы» зберагу рубель пяцьдзесят чатыры капейкі. Ды яшчэ на абедах рублі чатыры. Вось табе і падарунак! Тыдзень можна абысціся без абеду, а з курывам сяк-так пераб'юся каля сяброў...

На другі дзень я ўзяў у Ліны звычайны дзённы ліміт на абед і пайшоў на працу. Тут яно і пачалося...

— Вось табе і на-а!—праз нейкі час сказаў я супрацоўніку, які сядзеў за суседнім сталом.— Забыўся дома папяросы. Гэта ж трэба!—і для пацверджання сказанага паляпаў рукамі па кішэнях. Гэта быў удалы прыём! Сусед даў закурыць. Потым другі раз, трэці. А ў час абеднага перапынку я хадзіў па вуліцы і насвістваў песню вадавоза.

На другі дзень выдумляць было цяжэй. Не мог жа я два дні запар забываць папяросы! Але і тут памог выпадак. Я заўважыў, як наш малодшы бухгалтар дастаў з кішэні пачак балгарскіх цыгарэт, падышоў да яго і працягнуў руку:

— Кажуць, што балгарскія лепшыя за нашы. Дай паспрабую пусціць дым...

У дванаццаць гадзін сказаў, што зусім не хочацца есці. Чытаў стары раман, у якім героі толькі тое і рабілі, што пілі бургунскае і елі шашлыкі. Аж занудзіла. Кінуў кнігу і выйшаў у калідор. Там, каля плеценага кошыка для папер, было з паўсотні недакуркаў ад цыгарэт. Трапляліся амаль цэлыя! Я сказаў, што гэта свінства — кідаць недакуркі на падлогу, сабраў іх у паперыну і, азірнуўшыся, упіснуў яе ў кішэню. Дома я цыгарэткі растрыбушыў і, калі хацелася курыць, круціў з газеты самакруткі.

У такіх пакутах прайшоў цэлы тыдзень. І вось яна, сумачка, у маіх руках!..

Раніцою Восьмага сакавіка я ўрачыста, са слязою на вачах, паднёс падарунак. Ліне і ціха сказаў:

— Вось... Насі на здароўе.

Ліна схапіла падарунак, прыціснула да грудзей і шчыра адказала:

— Дзякуй! Гэта якраз тое, што трэба!..

Потым пабегла ў другі пакой, адчыніла шафу, пералічыла грошы. Вярнулася яна з пахмурным, як ноч, тварам.

— Дзе ты ўзяў грошы?!—спытала яна.— Ты пачынаеш хаваць ад мяне заробак?

— Не, Лінолюм!—засмяяўся я.—Цэлы тыдзень эканоміў. Разумееш, не абедаў, не курыў...

— Дык ты яшчэ ілжэш!—сумачка паляцела мне ў твар.— Увесь гэты тыдзень ад цябе несла гарам, як з тытунёвай фабрыкі! Ты пачаў хаваць ад мяне грошы!?

Што гаварыла жонка далей, я не чуў — куляй выляцеў на вуліцу. Хаджу і разважаю: «Што можна прыдумаць яшчэ? На якую ахвяру пайсці?»

Вечная праблема!

ЧАСОПІСЫ у сакавіку

ПОЛЫМЯ БЕЛАРУСЬ МАЛАДОСЦЬ

У нас ужо стала традыцыяй у пачатку кожнага месяца знаёміць чытачоў са зместам чарговых нумароў нашых літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь». Сёння мы расказваем аб тым, што можна будзе прачытаць неўзабаве ў сакавіцкіх кніжках гэтых часопісаў.

Паэзія. Можа таму, што сакавіцкія нумары «Полымя», «Маладосці» і «Беларусі» — першыя вясновыя нумары, можа па якой іншай прычыне, толькі паэзіі ў часопісах багата. «Полымя» змяшчае вялікія нізкі вершаў Максіма Танка, Еўдакіі Лось, Веры Вярбы, а таксама верш Янкі Непачаловіча «Партыя», якім адкрываецца нумар. У «Маладосці» друкуюцца вершы Уладзіміра Шурпы, Нэлы Тулупавай, Міколы Федзюковіча, Сямёна Блатуна, пародыі і эпіграмы Паўла Чаромхі на магілёўскіх пісьменнікаў. «Беларусь» прапануе сваім чытачам вершы Пятра Прыходзькі, Антона Бялевіча, Янкі Непачаловіча, Эдзі Агняцвет, Марка Смагаровіча, Уладзіміра Фаміна, Пятра Сушко, Яўгена Вераб'я. Тут жа змешчана новая байка Кандрата Крапівы «Шляхі да ісціны».

Проза. У «Полымі» яна прадстаўлена новым літаратурным кінасцэнарыем Аркадзя Куляшова і Максіма Лужаніна «Радыё ўсім», апавяданнем Міколы Лупсякова «Цёзка» і публікацыяй рамана Максіма Гарэцкага «Камароўская хроніка». Алена Васілевіч друкуе ў «Маладосці» аповесць «Мая ідылія», а Аркадзь Пінчук — апавяданне «Многа — мала». Часопіс «Беларусь» змяшчае два апавяданні Міхася Даніленкі — «Залатыя рыбкі» і «Альпійскі рамонак», апавяданне Валерыя Санько «Водсветы на асфальце» і гумарэску Юрыя Багушэвіча.

Публіцыстыка, нарысы. Гэты раздзел у «Полымі» прадстаўлены нарысам Віктара Карамазава «Ліменскі сшытак» і артыкулам Яўгеніі Шкляр «Старонкі гераічнай гісторыі». «Маладосць» друкуе рэпартаж Сцяпана Кухарава з магілёўскага завода «Строммашына», нарыс З. Мажэйка «Голас палескіх прастораў», нататкі студэнта Э. Гусейнава з паездкі на Нафтавыя Камяні ў Баку, лірычны вясновы фотанарыс Ю. Іванова, А. Каляды і М. Пянкрата. Надрукаваны ў нумары таксама артыкул сакратара ЦК ЛКСМБ Генадзя Жабіцкага «Будзем верныя справе бацькоў». Шмат публіцыстычных матэрыялаў у часопісе «Беларусь». Тут, у прыватнасці, надрукаваны артыкул упраўляючага трэстам «Белэнергабуд» К. Тэндзітнікава аб будаўніцтве Лукомльскай ДРЭС, выступленне першага сакратара Заводскага райкома КПБ г. Мінска І. Філатчанкава, нарыс М. Андрушчанкі пра камуністаў з Віцебскага станкабудаўнічага завода, выступленне першага сакратара Цэнтральнага райкома КПБ г. Гомеля М. Семенчука, артыкул начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Гродзенскага раёна С. Дзесюкевіча, артыкул І. Хаўратовіча аб падзеях на Беларусі ў перыяд першай рускай рэвалюцыі, нарыс П. Тормасава пра работнікаў Свіслацкай раённай бальніцы, дарожныя нататкі Міхася Калачынскага аб паездцы групы беларускіх пісьменнікаў у Таджыкістан на Тыдзень беларускай літаратуры і шматлікія іншыя матэрыялы.

Крытыка, літаратуразнаўства. Гэты раздзел багаты ў «Полымі». Тут змяшчаюцца артыкулы Уладзіміра Карпава «Позірк назад» (думкі аб прозе і крытыцы), «Плямы царскай цэнзуры» Міхася Смолкіна, «Цвяток радзімы васілька» Анатоля Клышко. М. Ярош рэцэнзуе кнігу Д. Бугаёва «Уладзімір Дубоўка», Ул. Юрэвіч — кнігу М. Стральцова «Жыццё ў слове», Р. Семашкевіч — зборнік вершаў А. Марціновіча «Чырвоныя ветразі». Да 70-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы змешчаны артыкулы К. Губарэвіча, Ул. Корбана і Р. Сабаленкі. Надрукавана ў «Полымі» таксама некалькі кароткіх рэцэнзій. У «Маладосці» ў раздзеле «Кнігі і час» змешчана рэцэнзія Ул. Юрэвіча на крытыка-біяграфічны нарыс «Уладзімір Дубоўка» Д. Бугаёва. «Кнігарня «Маладосць» у сакавіцкім нумары прысвечана кніжкам для дзяцей. Да юбілею К. Крапівы надрукаваны артыкулы А. Бялевіча і А. Сабалеўскага. У «Беларусі» да дня нараджэння К. Крапівы друкуюцца артыкулы В. Бурносава, Л. Рахленкі і З. Азгура. Тут жа рэцэнзуюцца кнігі Л. Прокшы «След вядзе за мяжу», С. Александровіча «Па слядах паэтычнай легенды», зборнік вершаў Е. Лось «Хараство».

Акрамя гэтага, на старонках «Беларусі» і «Маладосці» змешчана шмат іншых матэрыялаў.

На гэтай старонцы мы знаёмім чытачоў нашай газеты з некаторымі творамі, што змешчаны ў сакавіцкіх кніжках часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь».

БАЛАДА АБ ЛЕСЕ

Уладзімір ШУРПА
(«Маладосць»)

Заходжу я ў лес,
як у горад вялікі.
З намерам здзіўляцца,
убачыць,
адкрыць.
Зусім па-сяброўску ківаюць ялінкі.
І лес пачынае са мной гаварыць.

Лясныя сцяжынкі—экскурсаводы
Зблудзіць не дазволяць,
падкажуць маршрут.
Раскажуць,
як пешыя людзі,
падводы
Скрозь мірны гушчар прабіваліся
тут.

Як памяць,
узбоч інваліды-яліны,
Прыкрылі ядлоўцам крывыя камлі.
Па іхніх карэннях ляглі каляіны,
Глыбока пралеглі па роднай зямлі.

Дубы,
што к дарозе выходзілі блізка,
Памерлі, каб меншых братоў
зберагчы.
І сёння,
падобныя да абеліскаў,

Стаяць іх высокія пні і карчы.
Ды нельга дашчэнту знішчыць
жывое,
Жыццё, нібы праўду, не знішчыш
ніяк.

Ужо з-пад ялін паналечаных,
хвояў,
З-пад шэрых карчоў устае
маладняк.

Дубкі маладыя выпроставаюць
плечы.
А хвоі—адна за адну прыгажэй!
Няхай паспрабуе дарога пралегчы!
Цяпер давядзецца ёй значна
цяжэй...

Як дзеці да маці,
кусты-навасельцы
Імкнуцца пад сховы зялёных
шатроў.
І сёння іх ніводзін дубчык-цельцы
Прыкрыты надзейна ад жорсткіх
вятроў.

Як дрэва
падобнае да чалавека!
Вунь нават некалькі
дрэваў-стыляг.
Ды іх
утаймуе рука дрывасека,
Да сонца другім пракладаючы
шлях.

А лес будзе вечна стаяць на
планеце—
Мастацтва прыроды,
багацця кубы.
Каб мірна раслі навасаджанцы-
дзеці,
На варце стаяць будуць вечна
дубы.



Ілюстрацыя В. Шаранговіча да аповесці Алены Васілевіч «Мая ідылія» («Маладосць»).

МОВАЗНАЎЦЫ

Эдзі АГНЯЦВЕТ
(«Беларусь»)

Смела мовазнаўца трохгадовы
Усё знаходзіць, адкрывае словы.
Толькі з ложка цёплага ўстае—
Маме ён спакою не дае.

— А чаму завуцца хмаркі «небам»,
А зярняткі называюць «хлебам»?

Здзіўлены маленькі ад душы:
— Што такое «бомба»? Адкажы!
— Родненькі! — І маці затужыла,
Сына прытуліла, засланіла

Ад страшэнных прывідаў вайны,
Дзе калісьці гінулі сыны.

Быццам целам засланіла мама
І малых з далёкага В'етнама,
Што зазналі боль пякучых слоў:
«Бомба», «сірата»,
«траншэя», «кроў»...

Хай для юных мовазнаўцаў свету
Пахнуць словы сонцам, хлебам,
ветрам,
Яблыкамі,
мятай
і сасной,
Толькі—не вайной!

■ ■ ■

Нэла ТУЛУПАВА
(«Маладосць»)

Зноў ударыў зялёны гром,
Загула ледзяная сеча...
І прачнуўся ад сну Дняпро,
Распраўляе з палёгкай плечы.

Ён азябнуў, ільдамі скуты.
Дзень-другі непрыкметна пройдзе,
Затрашчаць ледзяныя путы,
Ірванецца Дняпро на поўдзень.

Захвалюецца па-хлапечаму,
Бо сустрэча з вясной ля мора.
Шлях ляжыць твой, Дняпро, ля
Рэчыцы,—
Прывітай жа мой родны горад.

Ён даўно на мяне ў крыўдзе,
Што знайшла я іншы прытулак...
Маці зранку на бераг выйдзе:
Мой паклон перадай матулі.

Ты вярнуцца, Дняпро, не зможаш,
Каб адказ мне яе прынесці...
Пэўна, зноў яе сны трывожаць,
Зноў у думках унучку песціць.

Белай пенаю талы снег.
Узмахні ты ёй, нібы стужкай...
Знаю: вестку матуля мне
Сёння з першай паслала птушкай.

НА МАГІЛЕ БАГДАНОВІЧА

Еўдакія ЛОСЬ
(«Полымя»)

Я ў прыгоршчах прынесла
Два дрэўцы-падлёткі
З марай, каб узляцелі
Да хмар аднагодкі.
На магілу паэта
Прынесла рупліва

Два браты-кіпарысы,
Зусім нешумлівых...
Працавала матыкай,
Рыдлёўкай капала,
Абсыпала зямлёю

Карэнне памалу,
Палівала вадою
З падгорнай крыніцы...
Кіпарысы,
Расціце!
Кіпарысы,
Ляціце!

Вы ж — заместа ядлоўцу
І думнага дуба,
Што растуць на радзіме
Максімавай любай.

ПАРТЫЯ

Янка НЕПАЧАЛОВІЧ
(«Полымя»)

Ты свяціла нам яркаю зоркаю,
Ведучы па дарогах крутых.
Хоць калісь жалуды елі горкія,
Ліст альховы служыў нам
махоркаю —
Ды натхняла на подзвігі ты.

Кожны ведаў: калі давядзецца
Пасці ў бітве за долю сваю —
Ярасць сэрца яго разальецца
Па сяброўскіх разгневаных сэрцах,
І сябры смертаносцаў даб'юць.

Справа наша, мы верылі, выслыве,
Нашу мужнасць ацэніць народ.
Мы не скорымся, здужаем, выстаім.
Ты ўрачыста паліла кастры свае,
Рыхтавала ў вялікі паход.

Мы, прайшоўшы дрыгвой і
чаротамі, —
Там, дзе чэрці прайсці не маглі, —
Смела рушылі ў бой з жываглотамі,
Што хацелі фашысцкімі ботамі
Растаптаць славу роднай зямлі.

Азараючы нас перамогаю,
Рвала рэйкі, крышыла масты.
Мы ішлі тваёй вернай дарогаю,
Здраду мерай караючы строгаю, —
Нас, як сталь, загартоўвала ты.

Калі сэрцы надзеяй заселены,
На шляху перашкоды — не страх.
Славай нашыя справы авеяны,
Як ніколі, мы сёння упэўнены,
Што ў жыцці выбран правільны
шлях.

ШЛЯХІ ДА ІСЦІНЫ

Кандрат КРАПІВА
(«Беларусь»)

БАЙКА

Жылі ў суседстве два Іваны.
Адзін — мудрэц —
Шукаў ва ўсім пачатак і канец.
Другі—прастак—
Жыў проста так.
Вось раз ідзе прастак з двара—
Касцюмчык, гальштук, папяроска,
— Куды?—пытае цёзка.
— Ды мне пара...
Вунь там у скверыку чакае
Чарнявая такая.
— Я бо гляджу—надраіў чуб,
Жаніцца думаеш?—А хоць бы й так?
— Дык ты ж не знаеш, што такое
шлюб.
— Я па-вучонаму адказваць не
бяруся,
Я хачу спачатку разабрацца.
Цяжкая, праўда, праца.
Вунь, бачыш, колькі кніг!
Усё пра шлюб сабрана ў іх
Ад самага Адама.
Дык вось мая праграма:
Пакуль да сутнасці не дабяруся—
Не ажанюся.
Ад першабытнае сям'і пачну.
— Ну-ну!
Жадаю поспеху.—Табе таксама.
Пакуль мудрэц, сабраўшы кніжак
стог,
І дзень і ноч над імі сох,
Пакуль дабраўся да матрыярхату,
Прастак прывёў Чарняўку ў хату.
Яшчэ прайшло мо год ці два—
Штудзіруе разумнік том за томам,
Трашчыць аж галава,
А ўсё канца няма крыніцам
невядомым.
Раз, глянуўшы на свет, разумны аж
здзівіўся:
Сынок у «дурня» нарадзіўся.
Ішлі гады сваёй хадою...
Пад старасць наш мудрэц,
Абросшы сівай барадою,
Знайшоў-такі пачатак і канец.
Але на сівізну кудзелі
Нявесты не глядзелі.

НЕМАН № 3

Трэці нумар часопіса адкрываецца інтэрв'ю са старшынёй Дзяржплана БССР А. П. Калошыным на тэму «Беларусь індустрыяльная».

Артыкул Янкі Казекі «Паэт, драматург, вучоны» прысвечаны сямідзесяцігоддзю Кандрата Крапівы. Аб кнізе Максіма Танка «Мой хлеб надзённы», вылучанай на атрыманне Ленінскай прэміі, расказвае Алесь Бачыла.

Проза прадстаўлена аповесцю А. Адамовіча «Вікторыя» і апавяданнямі Яўг. Васілёнка і І. Чыгрынава ў перакладзе на рускую мову.

У часопісе змешчаны вершы Е. Лось (пераклад В. Тараса) і Н. Зверавай.

У нарысе Р. Сабаленкі «Заўсёды ў дарозе» расказваецца аб сустрэчах аўтара з Г. І. Цітовічам.

Пра рускіх і беларусаў, якія ўдзельнічалі ў працы І Інтэрнацыянала, напісаў І. Шпадарук.

У раздзеле «Мастацтва» змешчаны артыкул Т. Чарняўскай «Архітэктурныя помнікі Магілёва».

Аб знойдзеных у архіве дакументах, якія адлюстроўваюць працу З. Жылуновіча (Цішкі Гартнага) у 20-я гады на пасадзе загадчыка Цэнтральнага архіва БССР, расказваецца ў артыкуле Я. Шорахава.

Пад рубрыкай «У нас на Беларусі» надрукаваны нататкі В. Бялькова «Бярэзінскі запаведнік».

ВЕРШЫ З НОВАЙ КНІГІ

Максім ТАНК
(«Полымя»)

ПІЯЛА

Мне піялу даў на ўспамін таварыш
З якой ён піў і радасць і адчай,
Арзу крутую і калмыцкі чай,
Палярны вецер і вайны пажары.

З яе сягоння кожны рад адпіць,
Бо дружбаю напоўнена да краю,
Блакітам неба сонечнага мая
І перазвонам стэпавых крыніц.

А тое, што ёсць горычы замнога,
Дык і яе падзелім, дружа мой,
Каб не здалася піяла цяжкой
Для аднаго і лёгкай — для другога.

НА ЛЯСНОЙ ДАРОЗЕ

Калёсаў ляскат.
Курганы.
Акопы.
Пчаліны звон над верасам духмяным.
Дзесь цецярук,
спалоханы,
залопаў.
Гарыць зара папахай партызана.
Тане дарога
ў зелень
баравую.
— Спі! Конь дацягне да свайго
дварышча...
— Мне лепш не спаць, бо сну я не
ўпільную
І апынуся зноў на папялішчах.
Зноў буду, ранены, брысці гушчарам,
Бінты зрываць,
тапіцца
ў хвалях Нёмна.
Таму, каб сон нас гэты не захмарыў,
Лепш, можа, песню даўнюю спяём
мы...
Вячэрні змрок згусціўся над дарогай.
І, заглушаючы калёсаў ляскат,
Над цішынёю бору векавога
Нясецца рэха
песні партызанскай.

РАДЗІМЕ

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ
(«Маладосць»)

Не скажу ні слова пра любоў
сваю —
ведаеш мяне ты без размоў.
Ведаеш, бы маці, —
голага і босага,
што ад слёз гарачых
не размок,
што ні зайздрасць
і ні рэўнасць лютая
не звалілі з ног,
не паланілі...
Дай руку, Радзіма:
слухай Рэвалюцыю —
у грудзях,
у левай палавіне.
Твае ўсе трывогі, хваляванні
ў трапяткім кавалачку сабраны.

Маё сэрца — вышыня,
заваяваная
пахаванымі на вышыні сябрамі.
Бой ідзе
між тупасцю і розумам —
барацьба працягваецца
за любоў
у чысціні бярозавай,
за далоні,
да святла працягнутыя.
Я хачу змагацца,
не памерці, —
каб жыццё сяброў не
абрывалася....
Твая дужасць
у маім, Радзіма,
сэрцы
прарастае сілай набрынялаю.

ДВА АПАВЯДАННІ

Міхась ДАНІЛЕНКА
(«Беларусь»)

ЗАЛАТЫЯ РЫБКІ

У ГЭТЫ вялікі камунальны дом Марк Осіпавіч усяліўся неяк непрыкметна. Доўгі час жыхары нават не заўважалі згорбленага, у выцвілым капелюшы старога, які штораніцы праходжваўся па шырокім двары новага мікрараёна. Ён тупаў паўз пастаўленыя яшчэ будаўнікамі альтанкі, заварочваў за вугал дома. Каля выхаду на ажыўленую туманную вуліцу стары спыняўся і нейкі час стаяў. За домам праносіліся машыны, шумеў горад, а тут было ціха. Праўда, цішыня гэтая панавала толькі да таго моманту, пакуль не прачыналіся дзеці. Але вось у двор выбягалі падшывальцы. Раздаваўся гулкі ўдар па мячу. Двор агалошваўся крыкамі, свістам. Мяч пралятаў паўз кволыя дрэўцы, уразаўся ў клумбы, збіваючы з маладых кветак начную расу.

Марк Осіпавіч задуменна глядзеў на дзяцей, ківаў сам сабе галавой і нешта шаптаў. Жыхары лічылі старога дзіваком. Бо хто ж, як не дзівак, усякі раз, калі паштарка прыносіла яму пенсію, бег у гастраном, купляў цукеркі, пернікі і частаваў імі дзяцей. Дзеці з двара, асабліва хлапчукі, ахвотна частаваліся ласункамі, што раздаваў ім Марк Осіпавіч, а потым, пусціўшыся ўроссыпь, гойсалі і галёкалі па двары да самага вечара.

Аднойчы стары прынёс у двор загорнутую ў мешкавіну вялікую шкляную скрынку. Сонечныя праменні так і пераліваліся ў кантах скрынкі, скакалі «зайчыкамі» на тварах дзяцей. Хлапчукі і тыя аж затаілі дыханне: у вадзе павольна, варушачы чырвонымі плаўнікамі, плавалі дзівосныя залатыя рыбкі.

— Ай, акварыум!—айкнуў рыжы Толік-першакласнік, які, здавалася, і ў сне бегаў за мячом. Жыхары дома, каб іх спыталі, наўрад ці адказалі б, калі гэты неўгамона спіць і ці спіць ён наогул.

— Гэта вам, — ветла сказаў Марк Осіпавіч.—І акварыум і рыбкі.

Малыя пераглянуліся: ім ніяк не верылася, што такое казачнае дзіва зусім чужы чалавек купіў для іх. Але ж Марк Осіпавіч кажа, што ён гэта купіў іменна ім, і яны ўжо ведалі: слову гэтага старога чалавека можна і трэба верыць.

Акварыум змясцілі ў пакоі цокальнага паверха, каля кацельні. Калі вячэрняе сонца ўжо не заглядвала ў акно пакоя, хлапчукі ўключалі электрычнае святло. У вадзе паважна плавалі рыбкі з чырванаватымі плаўнікамі. З дна падымаліся серабрыстыя бурбалкі — дно нібы дыхала. Усё было падобна на маленькае падводнае царства. Марк Осіпавіч збоку паглядваў на шчаслівыя тварыкі дзяцей і радаваўся ціхай старэчай радасцю.

Летам двор паступова пусцеў — многія школьнікі ад'язджалі ў піянерскія лагеры. І старому, калі ён адзін сядзеў у двары, усё часцей і часцей успамінаўся іржавы калючы дрот, жоўты пясок, слядкі і кроў яго дзяцей на тым пяску. Колькі год мінула з тых страшных дзён? А Марк Осіпавіч і цяпер чуў іх галасы... Цяпер бы ў іх былі ўжо і свае дзеці, і ён, Марк Осіпавіч, паказваў бы ім гэтых залатых рыбак між далікатных зялёных водарасцей.

...Памёр Марк Осіпавіч, як і жыў, ціха і непрыкметна. Быў ясны асенні дзень. У паветры ўжо лятала павуціна. За труной яго дарослых ішло мала. Доўгім ланцужком па двое і па трое ішлі амаль усе дзеці з таго самага вялікага двара. Першым, апусціўшы галаву, можа ўпершыню сціханы, ішоў рыжы Толік. За лета ён выцягнуўся, загарэў. Уражаныя смерцю дзядзькі Марка, усе яны ішлі і думалі аб ім, аб яго акварыуме, у якім плавалі залатыя рыбкі. Цяпер акварыум стаяў ужо не ў падвальным пакоі. Домакіраўніцтва выдзеліла ім прасторны піянерскі пакой на першым паверсе. І сонечныя промні, пранізаўшы чыстую ваду ў ім, свяціліся на сцяне вясёлымі, светлымі зайчыкамі.

АЛЬПІЙСКІ РАМОНАК

Чаго толькі няма на гэтым століку ў пакоі Ніны Іванаўны! Вось статуэтка балерыны. Дзяўчына нібы знаходзіцца ў працяглым палёце. Здаецца, вось-вось раскіне яна рукі-крылы, узаўецца ўвысь і — паляціць. Настаўніцы падабаецца, калі, разглядаючы статуэтку, чалавек не верыць, што яна выразана з дрэва.

— Так, так, — памаладому смяецца Ніна Іванаўна. — З самага звычайнага дрэва. Прытым заўважце: у скульптуры ўвекавечана мая вучаніца Ніначка Крукава... А разбяр ведаеце хто?

Скульптара ведалі многія. За апошнія гады імя яго ўсё часцей і часцей упаміналася ў друку. Яго абралі акадэмікам. Асобныя работы скульптара пераплылі акіян і там, у заморскіх краінах, таксама палянілі людзей сваёй глыбінёй і непасрэднасцю.

— Малайчына, Эдзік,—гаварыла Ніна Іванаўна.—І мяне, сваю настаўніцу, не забывае. Дарма што акадэмік, а ў пісьмах і са мною раіцца.

Яна асцярожна дакранаецца тонкімі пальцамі да таленавіта зробленай статуэткі і на момант задумваецца. Мабыць, нейкім сваім унутраным зрокам яна бачыць Ніначку Крукаву не балерынай на шырачэзнай сцэне праслаўленага тэатра, а маленькай дзяўчынкай-школьніцай з чарнільнымі плямамі на пальчыках. Плямы тыя ніяк не хацелі адмывацца...

На стале ляжыць некалькі кніг з дарункавымі надпісамі. Адна, тоненькая, з мудрагелістымі алгебраічнымі формуламі. Ніна Іванаўна спрабавала яе асіліць. Але дзе там! Былы яе вучань цяпер рашаў такія алгебраічныя ўраўненні, што не так проста было ў іх разабрацца і добра дасведчанаму чалавеку са спецыяльнай падрыхтоўкай.

Некалькі гадоў назад Ніну Іванаўну правялі на пенсію. Провады былі пышныя і ўрачыстыя, хоць сціплая вясковая настаўніца і не вельмі любіла падобныя шумныя ўрачыстасці. Ніна Іванаўна сядзела за святочным сталом, слухала добразычлівых прамоўцаў і сама сабе дзівілася: няўжо яна зрабіла столькі добрага, як пра яе гавораць? На сходзе зачытваліся тэлеграмы ад скульптара-акадэміка, ад таго прафесара, што пазней прыслаў брашуру з алгебраічнымі формуламі. Толькі ад Ніначкі Крукавай не было тэлеграмы. Як заўсёды, мітуслівая дзяўчынка і на гэты раз забылася прыслаць хоць колькі слоў сваёй любімай настаўніцы. Ды Ніна Іванаўна на яе і не крыўдзілася. Яна наогул за сваё жыццё амаль ніколі не крыўдзілася. У настаўніцы быў цудоўны талент: яна ўмела адшукваць у чалавеку харошае.

Пасля таго, як Ніна Іванаўна «выйшла» на пенсію і па вечарах ёй ужо не трэба было схіляцца над стопкай вучнёўскіх сшыткаў, і з'явіўся ў яе пакойчыку гэты столік з памятнымі падарункамі. У самым куточку яго, у скрыначцы са шкляным вечкам, ляжала засушаная кветачка, нечым падобная на рамонак. Тонкая яе сцяблінка пакрыта густым далікатным пушком. Некаторыя пялёсткі былі ўжо адваліліся і цяпер трымаюцца ў суквецці толькі таму, што іх асцярожна прыклеілі да кавалачка кардону.

Сціплую гэтую кветку амаль ніхто не заўважае. Усе ахаюць над статуэткай Ніначкі Крукавай, над кнігамі з аўтографамі. А Ніне Іванаўне падарунак гэты даражэй за ўсё. Настаўніца на момант заплюшчвае вочы і бачыць сябе ў «лясной школе», калі яна вучыла партызанскіх дзяцей. На ўвесь «клас» быў адзіны буквар. Яго прынёс ёй разведчык Пятро Голуб. А вучні пісалі і на бяросце, і на дошчачках. Іх назапашваў гаспадарлівы партызанскі кладаўшчык—дзед Даніла. Многім тады першую ў іхнім жыцці азбуку Ніна Іванаўна паказвала на тых дошчачках...

У адзін з асенніх дзён, калі на дасвецці лужыны сціналіся тоненькім лядком, Пятро Голуб прывёў у лес да Ніны Іванаўны худога абшарпанага чалавека. Твар—суцэльная калючая шчотка, а ў глыбіні вачэй чалавека—нейкі палахлівы і пякучы агонь. Агонь той не патух нават тады, калі чалавек да болю знаёмым голасам запытаўся ў настаўніцы:

— Не пазнаеце, Ніна Іванаўна?

— Божачка!—усклікнула яна, не верачы сваім вачам.—Эдзік Борбель?

Цесным колам іх абступілі дзеці, трымаючы ў руках «сшыткі»-дошчачкі, што настругаў дзед Даніла. Стаялі моўчкі, утаропіўшыся здзіўленымі позіркамі на барадатага дзядзьку ў падраных ботах. У іхнім яшчэ нядоўгім жыцці за гэтыя гады амаль кожны дзень здараліся многія незвычайныя падзеі, але бачыць, як буйныя, па гарошыне, слёзы каціліся з вачэй дарослага мужчыны, ім давялося ўпершыню.

— Ідзіце, дзеці, па буданах,—схамянулася настаўніца.—Сёння больш урокаў не будзе.

А потым Эдзік Борбель сядзеў з Нінай Іванаўнай на бервяне, што замяняла тут парту. Пятро Голуб пакінуў іх адных, зразумеўшы, што цяпер ён—лішні. З-пад падкладкі шапкі Эдзік дастаў засушанае каліўца нейкай расліны з кветкай і працягнуў яе настаўніцы:

— Гэта вам, Ніна Іванаўна. Яна уцякалі з канцлагера, там, у Альпах, сарваў. Эдэльвейс. Расце ў высокіх гарах, каля самага краю вечных снягоў. Вазьміце на памяць...

Што яна адчувала тады, партызанская настаўніца Ніна Іванаўна? Трошачкі ганарылася за сябе. Было радасна: усё ж помніў яе Эдзік Борбель! Помніў нават там, дзе на кожным кроку, на кожнай сцяжынцы падсцерагала яго смерць. Можа хоць крыху вялі яго і тыя яе словы, што пасеяла яна некалі ў яго душы.

Эдзік Борбель прабыў у іхнім атрадзе нядоўга. Толькі паспеў выразаць з алюмінія кліш для партызанскай газеты. З першым самалётам яго адправілі ў Маскву: перад вайной ужо ведалі здольнага маладога скульптара Борбеля...

Ніна Іванаўна глядзіць на кветачку за шкляным вечкам. Ён ніколі не забывае яе, Эдуард Борбель. Вось прыслаў статуэтку Ніначкі Крукавай. А калі быў некалькі дзён у іхніх Вішняках, дык наважыў быў ляпіць яе партрэт. Але Ніна Іванаўна не згадзілася. Навошта? Ён хоць і акадэмік, а не разумее, што гэтая вось кветачка з пушыстымі валаскамі на сцябліцы даражэй ёй за любую скульптуру.

ПАСЫЛКА Ў МАГІЛЕЎ

Аляксею ПЫСІНУ

Без барады і без залысін,
А ў класіку цаляе.
Бо з халастых паэт А. Пысін
Ніколі не страляе.

Пятру ШАСЦЕРЫКОВУ

Камень за каменем, год за годам.
Восень мінула, растала зіма.
Палацу б з'явіцца якраз нагода
Ды цэгла ў падмурку, а блокаў
няма.

Сяброўскія шаржы М. Лісоўскага («Маладосць»).

Малюнак мастака Ю. Пучынскага да апавядання В. Санько «Водсветы на асфальце» («Беларусь»).

АКЦЁРЫ І РОЛІ

АГНЁМ САТЫРЫ

У мінулую суботу — дзень 70-годдзя Кандрата Крапівы — для ўдзельнікаў урачыстага вечара купалаўцы ігралі свой даўні спектакль, які ўжо стаў класічным узорам беларускага сцэнічнага мастацтва. Ішла камедыя «Хто смяецца апошнім».

У спектаклі бралі ўдзел яго ветэраны — Л. Ржэцкая, Л. Рахленка, В. Пола, Г. Глебаў.

На юбілейным спектаклі гледачы зноў сустрэліся з выдатным акцёрам сучаснасці Барысам Віктаравічам Платонавым. Пасля даволі доўгай разлукі са сцэнай ён выступіў у адной са сваіх каронных роляў—ролі Зёлкіна.

Вобраз Зёлкіна артыст стварае з найтанчэйшым, сапраўды філігранным майстэрствам. Яго фантазія не ведае межаў. Пра майстэрства Б. Платонава ў ролі Зёлкіна можна гаварыць бясконца — у той вечар, пра які пішуцца радкі, ён узрушыў і ўзрадаваў гледачоў сваім тонкім артыстызмам, выдатнай тэхнікай.

Мне даводзілася глядзець спектакль «Хто смяецца апошнім» на розных этапах сцэнічнага жыцця, і ў шматгадовай рабоце артыста заўважалася адно і тое ж імкненне. У вобразе Зёлкіна ён не проста весела смяецца з чалавечых недахопаў, а імкнецца выкрыць і закляйміць ганебную з'яву. Сцэнічны вобраз Зёлкіна шліфаваўся, адточваўся менавіта ў гэтым кірунку, набываючы ўсё больш выразныя, востра сатырычныя абрысы. У юбілейны вечар у вобразе Зёлкіна Платонаў дасягнуў новай вяршыні. Выканаўца як бы падводзіў новую рысу пад сваімі мэтаімкнёнымі і вельмі паслядоўнымі пошукамі.

У яго Зёлкіне ёсць цяпер нешта страшнае, драпежнае.

...На працягу ўсяго спектакля нельга адбіцца ад думкі, што ў любы момант, асабліва, калі героям трэба пагаварыць сам-насам і калі зусім недарэчы пабочныя сведкі, з дзвярэй выскачыць Зёлкін, каб ураз накінуцца на свежанькую «навіну». За гэтымі дзвярыма сочыш з асцярогай, нібы сапраўды там стаіўся драпежнік, які ў самую нечаканую хвіліну можа кінуцца на чалавека.

І Зёлкін не прымушае сябе доўга чакаць. Дзверы «працуюць» з поўнай нагрузкай. Герой раз-пораз іх адчыняе, каб ціхай, мяккай хадою незаўважна ўвайсці на сцэну. Зёлкін жа павінен ведаць абсалютна ўсё: дзе, хто, калі, з кім, пра што гавару. А потым, дазнаўшыся пра гэта, ён добра ведае, што яму рабіць, за якую нітачку зручней пацягнуць. І калі ён вяртаецца за тыя ж самыя дзверы задаволены, яго добры настрой выклікае непакой. Можна чакаць, што пойдуць плёткі, будзе распушчана хлусня, каб зганьбіць нечае сумленнае імя.

Платонаў увесь час сатырычна завастрае вобраз, даводзячы яго да гратэску. І ў нейкі час пачынаеш успрымаць Зёлкіна неад'емна ад замочнай шчыліны. Гэта чалавек, які на свет, на людзей глядзіць праз замочную шчыліну і менавіта праз яе ўспрымае ўсё навакольнае. Адна з паэтычных метафар Маякоўскага ў спектаклі «Хто смяецца апошнім» з удзелам Платонава набывае рэальнасць, напаўняецца жыццёвым зместам.

І той самы Зёлкін, які не мае ніякай улады, які фактычна не мае сілы, як выяўляецца, здольны вельмі на многае. Ён траўміруе, тэрарызуе, а ў нейкія моманты амаль зусім нішчыць Тулягу. Ён здзекуецца з прафесара Чарнавуса, прыносіць у яго жыццё шмат прыкрых і горкіх хвілін. Зёлкін імкнецца зганьбіць добрае імя памочніцы Чарнавуса Веры. У той установе, дзе працуе, ён спрытна заблытвае ўсё на свеце, ствараючы для людзей і асабліва для іх творчай працы цяжкую, невыносную атмасферу. А калі іншыя супрацоўнікі паступова пачынаюць разблытваць вельмі заблытаны клубок, Зёлкін гатовы адразу, не раздумваючы, зваліць з сябе ўсё на цёцю Кацю. Зброя, якой ён карыстаецца, даволі такі небяспечная. І Платонаў зноў і зноў канцэнтруе ўвагу гледачоў менавіта на гэтай думцы.

Яго герой не з'яўляецца ценем Гарлахвацкага, а становіцца з ім у адзін рад, дзесьці зусім-зусім побач. Яго фігура не менш страшная і злавесная. І хоць вобраз Зёлкіна ў камедыі «Хто смяецца апошнім» не галоўны, у спектаклі з удзелам Платонава ён становіцца адным з самых значных. Б. Платонаў узнімаецца да вялікага абагульнення. Ён узводзіць Зёлкіна на вышыню буйнейшых класічных вобразаў.

Б. Платонаў у юбілейны вечар быў адным з самых выдатных змагароў. Яго сатырычная зброя біла па праціўніку без промаху.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

МАЙСТРЫ ЭКСЛІБРЫСА

Сёння ў нашай краіне ўжо не спрачаюцца, патрэбен ці не патрэбен экслібрыс. Толькі за апошнія дзесяць гадоў савецкімі мастакамі створана ў дзесяць разоў больш экслібрысаў, чым за два з палавінаю стагоддзі ў дарэвалюцыйнай Расіі. Экслібрысы малююць для асабістых кніжных збораў, для бібліятэк гарадоў, палацаў культуры, калгасаў, воінскіх часцей. У Эстонскай ССР, напрыклад, ёсць прадпрыемствы, дзе рабочыя і інжынеры прыдбалі асабістыя кніжныя знакі, якія адлюстроўваюць густы і захапленні ўласніка кніг; школы, дзе кожны настаўнік мае свой экслібрыс; саўгасы, дзе ва ўсіх работнікаў ферм і брыгад ёсць асабістыя бібліятэкі і ўласныя кніжныя знакі. Над экслібрысамі ў Эстоніі працуе больш за дзвесце майстроў пэндзаля і алоўка.

Далёка за межамі Латвіі вядома імя неперавышанага майстра экслібрыса Петэрыса Упіціса. У Расійскай Федэрацыі славяцца кніжнымі знакамі Уладзімір Багданаў і Мікалай Каліта, Георгій Карлаў і Вадзім Фралоў, а таксама шмат іншых майстроў. Арменія вылучыла аднаго з лепшых майстроў кніжнага знака, заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі Рубена Бедрасава. Украіна — Ігара Бенетава, Канстанціна Казлоўскага, Стэфанію Гебус - Барнецкую...

Летась выдавецтва «Кніга» выпусціла ілюстраваную працу «Савецкі экслібрыс», а нядаўна Тамбоўскае абласное выдавецтва парадавала аматараў кніжнага знака брашурай пра экслібрысы вялікага савецкага майстра заслужанага дзеяча мастацтваў Узбекістана Георгія Мікалаевіча Карлава.

Галіна МІЛАЕВА, карэспандэнт АДН.

ПАЭМА З КАМЕНЯ

Турысты прывыклі бачыць цудоўны храм на беразе ракі Нерлі ля яе зліцця з Клязьмай у летні час, калі ён асабліва прыгожы на фоне заліўных лугоў, што прасціраюцца аж да гарызонта, і адлюстроўваецца ў воднай гладзі. Але і на фоне зімняга пейзажу — сярод снягоў і лёду — гэтая стройная «паэма з каменя» дзівосна прыгожая.

Аднаму з самых велічных твораў рускага народнага генія — царкве Пакрова на Нерлі споўнілася васемсот гадоў. Пабудавана яна была безыменнымі дойлідамі і мулярамі Уладзіміра-Суздальскага княства па загадзе князя Андрэя Багалюбскага. Як сведчыць паданне, князь вырашыў пабудаваць храм у памяць аб любімым сыне і іншых рускіх воінах, якія загінулі ў бітве за родную зямлю.

Царква на Нерлі знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад старажытнага рускага горада Уладзіміра. Яна параўнальна добра захавалася. Як і восем стагоддзяў назад, будынак здзіўляе сваімі вытанчанымі прапорцыямі, цудоўнай стройнасцю і лёгкасцю. Ён увесь скіраваны да неба, нібы бязважкі.

Асноваю будынка з'яўляецца каркас з шаснаццаці крыжападобных слупоў: дванаццаці знадворных, якія ўтвараюць фасады, і чатырох унутраных, звязаных паміж сабою і са знадворнымі слупамі падпружнымі аркамі таго ж профілю. Гэтыя слупы падтрымліваюць барабан купала. Дванаццаць вонкавых слупоў, звязаных аркамі зверху, утвараюць трохпралётныя аркады фасадаў, запоўненыя сцяной, якая нясе пластычнае разное ўпрыгожанне. Спачатку храм увенчваў купал у пазалочаным шлеме. Пазней яму надалі форму цыбуліны.

Сярод белакаменных разных упрыгожанняў вылучаецца адлюстраванне біблейскага цара Давіда, які іграе на гуслях. Фігура акружана птушкамі і львамі. Ля іх — грыфоны, якія разрываюць ягня. Па баках жаночыя маскі, характэрныя для ўсіх уладзіміра-суздальскіх храмаў, прысвечаных матцы боскай. Рэльеф з фігураю Давіда стварае кампазіцыю, якая паўтараецца на ўсіх трох фасадах.

Зверху, на сярэдзіне вышыні будынка, праходзіць аркатурны пояс на стройных калонках, якія абапіраюцца на разныя з белага каменя кансолі-маскі. Уся разьба выканана непасрэдна на каменных блоках муроўкі сцен, у выніку чаго дасягаецца асаблівае адзінства ўсёй кампазіцыі, уласцівае найбольш велічным помнікам сусветнай архітэктуры.

Па-майстэрску, вельмі тонка выкананы белакаменныя разныя ўпрыгожанні парталаў. Унутраная прастора храма адпавядае вонкаваму абліччу збудавання. Інтэр'ер царквы надзвычай светлы і лёгкі.

Храм Пакрова быў пабудаваны на штучна зробленым пагорку. Некалі ён быў выбрукаваны белым каменем і меў вадасцёкі. Падмуркі храма закладзены вельмі глыбока — на 5 метраў 30 сантыметраў.

Высокая архітэктурная дасканаласць царквы на Нерлі, арганічная сувязь яе з навакольнай прыродай, пейзажам ставяць гэты унікальны помнік у адзін рад з лепшымі творамі сусветнага дойлідства.

Безыменныя будаўнікі нібы хацелі ўвасобіць у камені саму старажытную Русь, яе сілу, славу, магутнасць і прыгажосць. Вось чаму тысячы людзей прыязджаюць сюды паглядзець на унікальны помнік, вядомы мільёнам людзей па шматлікіх мастацкіх рэпрадукцыях.

— Калі я здалёк глядзела на царкву Пакрова, мне здавалася, што яна з лебядзінай грацыяй нібы плыве на фоне велічных воблакаў. Гэтую прыгажосць нельга перадаць словамі. Я б назвала гэты дзівосны помнік белым лебедзем Расіі, — так сказала міс Альвіна Лукас з Канады, аглядаючы цудоўны помнік.

Інжынер Васіль Гаршкоў (Масква) расказвае:

— Калі я маю вольны час, абавязкова еду ва Уладзімір і гадзінамі любуюся непаўторнымі помнікамі рускага дойлідства. Гэта памагае мне ў рабоце.

Архітэктура з'яўляецца адным з высакароднейшых відаў мастацтва, а таму нельга не пагадзіцца з думкаю вялікага рускага пісьменніка Льва Мікалаевіча Талстога, які гаварыў, што мастацтва ёсць магутная зброя яднання людзей.

Гэтыя словы міжвольна ўспамінаюцца цяпер калі мноства людзей розных нацый едуць на бераг Нерлі, каб палюбавацца цудоўным помнікам рускага нацыянальнага дойлідства.

Уладзімір ЛЮБІМАЎ, інжынер-будаўнік. (АДН).

І ЗНОЎ «АННА КАРЭНІНА»

Адзін з буйнейшых майстроў савецкага кінематографа А. Зархі распачынае на студыі «Масфільм» здымкі карціны «Анна Карэніна» па аднайменнаму раману Л. Талстога. Па просьбе карэспандэнта АДН кінарэжысёр расказвае пра сваю новую работу.

Аляксандр ЗАРХІ, кінарэжысёр, народны артыст РСФСР

Калі з'явілася першае паведамленне пра тое, што на «Масфільме» будзе ажыццёўлена экранізацыя талстоўскай «Анны Карэнінай», дык літаральна праз некалькі дзён да нас на студыю пачалі паступаць сотні пісем з усіх канцоў краіны. Гэта быў цудоўны прыклад зацікаўленасці гледачоў. Студэнты, рабочыя, вучоныя выказвалі свае пажаданні рэжысёру, давалі парады па падбору акцёраў і нават выяўленчым вырашэнні асобных сцэн. Перабіраючы штодзённа вялікія стосы ўсё новых пісем, я бачыў, як глыбока людзі ведаюць гэты раман, разумеюць яго герояў. Я адчуваў, якая адказнасць кладзецца на плечы мастака, які адважваецца ўвасобіць на экране неўміручы твор Льва Талстога.

Нярэдка пытаюцца, чаму я, паставіўшы не адзін фільм пра людзей рэвалюцыі, пра нашых сучаснікаў, вырашыў узяцца за экранізацыю «Анны Карэнінай». Думаю, што рэжысёр не павінен сябе тэматычна абмяжоўваць. Але не толькі гэтым я кіраваўся. Мне здаецца, што ў свеце сям-там адбываецца небяспечная з'ява—забыццё найвялікшага праяўлення чалавечай прыроды — кахання. У літаратуры, у кіно бачыш, як гэтае пачуццё замяняецца паняццем парнаграфічнай вульгарнасці. Каханне разменьваецца на драбнюткія сексуальныя, жывёльныя страсці.

Сусветная літаратура стварыла два найвялікшыя вобразы — мужчынскі і жаночы, Гамлета і Анну Карэніну. Праз далеч часоў яны нясуць адну вялікую думку: сапраўднае каханне вучыць любві да жыцця, да людзей, вучыць рабіць дабро. Але яно не можа існаваць у атмасферы крывадушнасці і прадажнасці. Яно адыходзіць у самое сябе і гіне. Не выпадкова «Гамлет» і «Анна Карэніна» маюць вялікую колькасць кінематаграфічных інтэрпрэтацый. Анну Карэніну ігралі Аста Нільсен, Грэта Гарбо, Вів'ен Лі. Марыць сыграць Сафі Ларэн. І я ведаю, што мастакі розных краін яшчэ вернуцца да вялікай трагедыі, створанай Львом Талстым.

У нас у ролі Анны Карэнінай будзе здымацца Таццяна Самойлава. Чаму іменна яна? Таццяна цудоўная актрыса, прычым, актрыса трагічнага плана. Ва ўнутраным яе свеце і ў знешнім абліччы ёсць, на мой погляд, усе якасці, неабходныя для стварэння вобраза Анны Карэнінай. У ёй ёсць, як пісаў Леў Талстой, «і таямнічая і д'ябальская прывабнасць», не «звычайная» прыгажосць жаночага твару, а іменна тая «нетутэйшая», «паэтычная», якой вылучалася Анна сярод усіх пецярбургскіх прыгажунь.

Звычайна мне не даводзілася здымаць славутых акцёраў. На гэты раз у нашым фільме здымаецца цэлае сузор'е. Я маю на ўвазе запрашэнне на ролю Карэніна Інакенція Смактуноўскага, якога кінагледачы добра ведаюць па «Гамлету». Там яго герой быў малады, а тут яму давядзецца стварыць вобраз умудронага жыццём і вопытам мужчыны — Карэніну ў рамане 48 гадоў.

Карэнін — адзін з самых цудоўных вобразаў у сусветнай літаратуры. Думаю, што трактоўка Карэніна як чалавека-машыны, які ўвасабляе сабою закон, правільная. Але правільна і другое. У нейкія хвіліны ў Карэніне прачынаецца чалавечае, задушанае навакольнай атмасферай, пасадаю. Калі Леў Талстой ставіць Карэніна ў цяжкія сітуацыі, дык усё, што ў ім наглуха закрыта бюракратычнай абалонкай, раптам прарываецца найвялікшым адкрыццём чалавечага духу. У Талстога гэта, як заўсёды, вельмі складанае і на першы погляд супярэчлівае, але ў вышэйшай ступені праўдзівае.

Мікалай Чарнышэўскі пісаў пра Талстога: «Ён раскрыў дыялектыку душы». І ён сто разоў меў рацыю, бо пісьменнік ніколі не ўспрымаў сваіх герояў прасталінейна і чыста вонкава. Інакенція Смактуноўскага— аднаго з цікавейшых акцёраў нашага часу — чакае складаная і цікавая работа.

І яшчэ адна «зорка» — Ія Савіна, вядомая многім па фільму «Дама з сабачкам». Ія будзе іграць Долі Аблонскую. Рэпетыцыі і пробы, якія папярэднічалі здымкам, паказалі, які рознабаковы талент актрысы, як яна валодае таямніцамі пераўвасаблення, становіцца старэйшая за свае гады, ператвараючыся ў звычайную і рана пасівелую Долі Аблонскую. Я баяўся, што маладосць актрысы перашкодзіць ёй стварыць вобраз жанчыны, абцяжаранай клопатамі аб дзецях, праблемамі ўзаемаадносін з «шалапутным» Сцівам Аблонскім. Рэпетыцыі і пробы пераканалі мяне, што Ія Савіна праўдзе цікавую акцёрскую работу.

У ролі Кіці — Насця Вярцінская. З яе багатымі здольнасцямі нас пазнаёмілі фільмы «Гамлет», «Вайна і мір». Але яна не захапляецца першымі поспехамі і як сур'ёзная актрыса прадумана падзяляе свой час паміж здымкамі і вучобаю ў Шчукінскім тэатральным вучылішчы.

У чытачоў, вядома, можа ўзнікнуць пытанне: чаму нічога не сказана пра аднаго з галоўных выканаўцаў — Уронскага. Пакуль што пытанне, хто яго будзе іграць, яшчэ канчаткова не вырашана.

Фільм будзе шырокафарматны, каляровы. Аператар Леанід Калашнікаў і мастак Аляксандр Барысаў шмат часу аддалі эксперыментальным работам у галіне колеру, пошукам правільных вонкавых выяўленчых рысаў будучага фільма, якія адпавядалі б эпосе. Для таго, каб аднавіць час у эскізах касцюмаў, дэкарацый, абсталявання пакояў, ім давялося прагледзець тысячы старых часопісаў. Вядома, што героі фільма былі цесна звязаны з Францыяй, з французскім мастацтвам.

У апошні час у нашых дыскусійных клубах вельмі модна спрачацца аб праблемах экранізацыі. Многія крытыкі — я б сказаў, большыя каталікі, чым сам папа, — гавораць пра немагчымасць і непатрэбнасць экранізацыі літаратурных твораў, пра неабходнасць вярнуць кінематограф выключна да арыгінальных сцэнарыяў.

Тут пытанне, на мой погляд, простае і яснае. Калі вынік добры — гэтых пытанняў не ўзнікае, як не ўзніклі яны ў сувязі з «Гамлетам», «Гронкамі гневу», «Мостам церав раку Квай» і гэтак далей. Думаю, што і само па сабе пытанне «быць ці не быць» — пустое. Але, маючы некаторы вопыт, жартам магу сказаць: экранізаваць лягчэй дрэнны або сярэдні літаратурны твор, у якім рэжысёр паўнаўладна распараджаецца лёсам персанажаў і падзей. І значна складаней, адказней — класічны. У гледачоў абавязкова ўзнікнуць паралелі: маўляў, у рамане — больш поўна і цікава, чым у фільме. Пра ўсё гэта мы думалі з Васілём Катаняным, калі пачыналі пісаць сцэнарый. Аднак ацэньваць зробленае, вядома, не нам.

Ці павінен кінематограф абмінаць складаныя класічныя Манбланы, баючыся апынуцца ніжэйшым за іх. Ці можа кінематограф — найвялікшае масавае мастацтва сучаснасці — прайсці міма іх, не паспрабаваўшы дасягнуць хоць бы подступаў да гэтых найвялікшых вяршынь чалавечага генія? Думаю, што не! І зусім магчыма, што кінематаграфісты, якія займаюцца гэтым сёння, пракладваюць шлях тым, хто яшчэ вернецца да Шэкспіра і Бальзака, Чэхава і Талстога, хто, адштурхоўваючыся ад нашых памылак, будзе яшчэ з большым поспехам браць вяршыні.

Якімі кінематаграфічнымі выяўленчымі прыёмамі трэба карыстацца для перадачы на экране твора Льва Талстога? Першыя месяцы нашых пошукаў былі пакутлівыя, складаныя. Можа быць, узяць на ўзбраенне прыёмы сучаснага мастацтва? Пабудаваць сцэнарый як успаміны Анны, паказаўшы шырокімі мазкамі ўсё, што адбылося? Або як расказ Уронскага перад ад'ездам на Балканскі фронт. А, можа, выкарыстаць прыёмы нямога кінематографа? Колькі іх было — гэтых «можа быць»!

Я ўспамінаю першыя варыянты сцэнарыя, дзе, як мне здаецца, не быў яшчэ знойдзены кінематаграфічна выразны эквівалент рамана. У іх, калі не хапала выяўленчых сродкаў, гучаў голас аўтара. Але паступова, ад варыянта да варыянта аўтарскага тэксту станавілася ўсё менш і менш, пакуль ён не знік.

Раман Льва Талстога — і не толькі раман, а ўся творчасць пісьменніка схілілі нас да больш спакойнай, класічнай формы падачы падзей, ідэй. І не баючыся праславіцца як кансерватары, мы напісалі сцэнарый, паўтараючы акрэслены, ясны, просты стыль Талстога, падпарадкоўваючыся яму.

У ранейшых кінематаграфічных варыянтах «Анны Карэнінай» заўсёды адсутнічала лінія Левін — Кіці. Заставаўся толькі адзін трохкутнік Анна — Уронскі — Карэнін. Без гэтай лініі выпустошваецца ідэйна-філасофскі змест рамана. Мы хочам раскрыць у вобразе Левіна погляды самога аўтара рамана. У сцэнарый не ўвайшла восьмая частка эпапеі, якая яшчэ пры жыцці Талстога выклікала спрэчкі. Мы пакінулі Левіна чалавекам, які кідаецца, шукае спалучэння шчасця асабістага са шчасцем народа. Такі быў сам Леў Талстой да самых апошніх дзён свайго вялікага жыцця.



З 5 сакавіка ў Мінскім цырку паказваецца новая праграма. На арэне выступаюць паветраныя гімнасты, жанглёры, эквілібрысты, канатаходцы, сілавыя акрабаты, а таксама папулярныя комікі — заслужаны артыст РСФСР Юрый Нікулін і артыст Міхаіл Шуйдзін. Народная артыстка РСФСР Ірына Бугрымава паказвае атракцыён «Дрэсіраваныя львы».

На здымку — выступае Ірына Бугрымава.

Фота УЛ. КРУКА.

ФРАНЦУЗСКАЯ ПЕСНЯ СЁННЯ

Да нядаўняга часу вар'етэ, радыё і тэлебачанне Францыі, як і большасці іншых заходніх краін, былі напоўнены песнямі-завываннямі калматых, неахайна апранутых маладых людзей. Гэта працягвалася некальні гадоў. Але летась адбыліся некаторыя змены.

Не так даўно 5 000 парыжан, можна сказаць, пяць тысяч маладых парыжан, запоўнілі вялікую залу Мюцюалітэ ў Парыжы, каб паслухаць савецкіх паэтаў, якія чыталі свае вершы. Ніколі ніводзін французскі паэт не адважыўся б на гэта. Можна сказаць, што ў Францыі паэзія ў форме вершаў ніколі не прыцягвала ўвагу вельмі шырокай публікі. І нават выключна паэтычныя, шырока вядомыя публіцы творы апошніх выдатных французскіх паэтаў, такіх, як Элюар, Както, Прэвер, Арагон, выдаваліся тыражом не больш некалькіх дзесяткаў тысяч экземпляраў. Творы самога Віктора Гюго — найбольш пладавітага і найбольш чытаемага з французскіх паэтаў — былі выдадзены таксама вельмі абмежаваным тыражом, і ён вядомы ў асноўным як раманіст.

Для паэзіі характэрна тое, што яна нараджае песню, а сёння, магчыма, нават сама становіцца песняй. Можна пачуць, як рабочы ля станка або селянін на полі спявае песні на вершы Віктора Гюго. Некаторыя вершы Гіёма Апалінэра, хоць ён памёр у 1918 годзе, не былі вядомыя вялікай колькасці людзей да таго часу, пакуль іх не пачаў выконваць Іў Мантан.

І, наадварот, словы песень сталі вершамі, зборнікі якіх выдаюцца ў Францыі. Выключны факт у гісторыі Францыі: 200 000 экземпляраў аднаго з такіх зборнікаў, у які ўвайшлі сто песень Жоржа Брасенса, былі распрададзены на працягу некалькіх месяцаў.

У 1965 годзе «старыя» паэты-песеннікі зноў выйшлі з забыцця і вось ужо на працягу некалькіх месяцаў выступаюць на французскай сцэне. Але яны вярнуліся не адны, яны вярнуліся з новым маладым пакаленнем песняроў, такім шматлікім і такім таленавітым, што крытыка цяпер гаворыць пра паваротны момант.

Хто ж яны, гэтыя маладыя песняры? Іх занадта многа, каб пералічыць усіх. Але можна намаляваць некалькі найбольш характэрных, найбольш яркіх фігур. Гэта, у прыватнасці, Жыльбер Беко і Жан Брэль, якія наведалі нядаўна Савецкі Саюз.

...Пра каханне, пра нянавісць да вайны, пра нізасць буржуазіі, пра вялікую справу свабоды былі напісаны тоны цяжкіх для разумення вершаў. Але каб паслухаць песні на гэтыя тэмы, выконваемыя Жакам Брэлем, сотні тысяч людзей спяшаліся ў канцэртныя залы і мільёны іншых куплялі пласцінкі з яго песнямі. Брэль не іграе на гітары, ён кідае свае песні ў залу, як выклік. Ён не пакідае публіцы часу на апладысменты. Гэта — мяцеж. Мяцеж супраць класа багацеяў, да якога належала яго сям'я, мяцеж супраць вайны, супраць буржуазных забабонаў.

І яшчэ адно імя. Імя самага маладога песняра. Гэта Жан Фера — самы малады і самы ваяўнічы. Гэтыя маладыя паэт-песеннік карыстаецца поспехам не толькі ў рабочых аўтамабільных заводаў «Рэно», але і ў шырокіх мас аматараў песні. Тое, пра што ён апавядае і што абараняе як паэт, — гэта моладзь і спадзяванні нашага часу. Ён пяе аб мужнасці матросаў «Пацёмкіна», аб пакутах і прыніжэннях у нацысцкіх лагерах, аб забойстве Федэрыка Гарсія Лоркі, аб рэвалюцыянерах 1789 года.

Сённяшнія французскія песеннікі-шансанье цалкам належаць свайму часу. Яны ўдзельнічаюць у вялікай бітве ідэй, што ўвесь час адраджаецца ў Францыі, дзе знамянальныя, палітычныя і філасофскія рознагалоссі і супярэчнасці накладаюць свой адбітак на ўсё.

...Калі французскія тэлегледачы патрабавалі ад дзяржаўнага тэлебачання перадаць у выкананні Жана Фера яго песню «Пацёмкін» на словы Жоржа Кулонжа, якая была забаронена, гэта было вялікай перамогай. Іменна з гэтай перамогі трэба зыходзіць, гаворачы пра будучыню французскай песні.

А. МАНЬЕНАН, карэспандэнт ТАСС.

Парыж.

КУТОК КАЛЕКЦЫЯНЕРА

ГЕРОІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Дзве паштовыя мініяцюры, выпушчаныя Міністэрствам сувязі СССР да Дня Савецкай Арміі 1966 года, прысвечаны двойчы Герою Савецкага Саюза генерал-лейтэнанту авіяцыі Рыгору Краўчанку і Герою Савецкага Саюза гвардыі старшыны Мікалаю Ільіну.

Р. Краўчанка, імем якога названа адна з вуліц Масквы, геройчна змагаўся на чале авіяцыйнага знішчальнага палка ў небе Мангольскай Народнай Рэспублікі, калі японскія мілітарысты парушылі яе межы і разгарнулі баі ў Халхін-Голе. Потым Р. Краўчанка камандаваў авіяцыйным злучэннем на франтах Вялікай Айчыннай вайны і загінуў смерцю адважных у лютым 1943 года. Яго прах пахаваны ў Крамлёўскай сцяне.

Гвардыі старшына Герой Савецкага Саюза Мікалай Ільін быў адважным снайперам мінулай вайны. На яго рахунку пяцьсот знішчаных гітлераўцаў. Ён загінуў у баях пад Харкавам.

Маркі маюць адзінае серыйнае афармленне. На іх намаляваны партрэты Р. Краўчанкі і М. Ільіна, Зорка Героя Савецкага Саюза. Марка з партрэтам Рыгора Краўчанкі выканана ў спалучэнні блакітнага і цёмна-ліловага колераў, а марка, прысвечаная М. Ільіну, мае аранжавы фон. На кожнай з марак надпіс: «Залічаны навечна ў спісы часці». Маркі маюць аднолькавы намінал— чатыры капейкі. Друк—глыбокі, Зубцоўка — грабенчатая. Памеры — 23,5 на 35,5 міліметра.

Аўтар малюнкаў — мастак Васіль Зав'ялаў.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

Аддзел вядзе загадчык кафедры замежных моў Віцебскага медыцынскага інстытута П. АБРАМЕНКА

НАРОЎНІ З МУЖЧЫНАМІ

Прафесія рабаваўніка банкаў не з'яўляецца больш толькі мужчынскай справай. Нядаўна гамбургскі філіял банка Штэлінга быў абрабаваны маладой жанчынай. Бялявая прыгажуня, падышоўшы да акенца касы, спакойна выняла з сумачкі буйнакаліберны пісталет і прымусіла касіра даць ёй усе грошы, якія былі ў касе. Раней, чым банкаўскія чыноўнікі змаглі апомніцца, рабаваўніца села ў аўтамабіль і знікла.

«Морген».

МАКАРОННЫ СТРЫПТЫЗ

Амерыканцы, якія жывуць у Парыжы і займаюць там цэлы квартал, правялі нядаўна фестываль сюрпрызаў. «Цвіком» праграмы фестывалю з'явіўся «макаронны стрыптыз». Зусім голая актрыса, выйшаўшы на сцэну з каструляй вараных макаронаў, пачала чапляць іх на сябе, пакуль не атрымалася падабенства сукенкі. Даўшы прысутным палюбавацца сваім адзеннем, яна пачала распранацца, кідаючы публіцы жмені макаронаў, якія тут жа прагна з'ядаліся. Арганізатары выставы горда заявілі карэспандэнтам: «Такога відовішча вы больш нідзе не ўбачыце!»

«Вохенпост».

СЯРЭДНЕВЯКОВЫЯ РЫТУАЛЫ

Першакурснік універсітэта ў Утрэхт (Галандыя) задыхнуўся ў мяшку з сажай у час рытуалу прыёму яго ў тайны студэнцкі клуб. У Утрэхце, як і ў іншых універсітэтах, існуе шэраг тайных студэнцкіх клубаў, якія існуюць з часоў сярэдневякоўя. Гэтыя клубы маюць свой «Кодэкс гонару» і шмат варварскіх рытуалаў, асабліва для прыёму новых членаў. Адзін з рытуалаў прыёму навічкоў у клуб заключаецца ў тым, што іх зачыняюць у пакой, усыпаны гнілой гароднінай і гноем, і затым заганяюць туды вялікую свінню, папярэдне напаіўшы яе рыцынай. Афіцыйна тайныя клубы забаронены, але паколькі большасць іх членаў паходзяць з багатых сем'яў, дык паліцыя лічыць за лепшае не ўмешвацца.

«Вохенпост».

«КЛАСІК БЯЗГЛУЗДАГА ТЭАТРА»

У Эсене (ФРГ) нядаўна адбылася прэм'ера п'есы прадстаўніка адной з новых плыняў у драматургіі, які называе сябе «класікам бязглуздага тэатра». Змест гэтай эпахальнай рэчы такі: чалавек нараджаецца насуперак свайму жаданню, жыве нейкі час нікому не патрэбны, чакае таго, чаго ніколі не будзе, і, нарэшце, памірае.

«Цайт».

ТОЛЬКІ ДЛЯ БЕЛЫХ

Міністр пошт Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў гутарцы з карэспандэнтамі заявіў: «Наша цудоўная расавая палітыка мае адзін невялікі недахоп: яна не дазваляе нам мець дзяржаўнае тэлебачанне, бо негры глядзелі б на сваіх экранах тое ж самае, што і мы, белыя».

«Вохенпост».

ВОГНІШЧА З КНІГ

У Дзюсельдорфе (Заходняя Германія) члены маладзёжнай евангелічнай арганізацыі «Рашучыя хрысціяне» наладзілі на беразе Рэйна спальванне шкодных кніг. На вогнішча трапілі кнігі французскай пісьменніцы Франсуазы Саган і раду заходнегерманскіх пісьменнікаў, чые творы «Рашучыя хрысціяне» лічаць антынямецкімі. Дзюсельдорфская паліцыя была інфармавана, але не палічыла патрэбным умешвацца.

«Вохенпост».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 сакавіка

Першая праграма. 11.10 — праграма перадач. 11.15—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Расказы аб прыродзе». Перадача з Ленінграда. 12.05—«Для вас, дарагія мамы». Канцэрт мастацкай самадзейнасці мінскіх школьнікаў. 12.45—для малышоў. «Машанькіна вуліца». Маляваны фільм. 13.00—«Музычная шкатулка». 13.20 —«Дочкі Радзімы». Перадача, прысвечаная Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка. 14.10—«Вам, жанчыны». Святочны канцэрт. 15.10—«Жанчыны-кампазітары Ленінграда» (М). 16.00—урачыстае пасяджэнне, прысвечанае Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка (М). 17.30—«З кінакамерай замест ружжа». Кінанарыс. 17.55—«Сяброўкі». Мастацкі фільм. 19.30—тэлевізійныя навіны (М). 20.00—першынство свету па хакеі. ЧССР—ЗША. Перадача з Любляны. У перапынку—дзённік Спартакіяды народаў СССР (М). 21.40—«На агеньчык» (М).

Другая праграма. 12.05—для дзяцей. «Канікулы Баніфацыя». Мультыплікацыйны фільм (М). 12.25—для дзяцей. «Зорачка». Перадача з Рыгі. 12.55—«Сельская навіна» (М). 13.25—тэлевізійныя навіны (М). 13.35 — «Сузор'е». Фабрыка «Новая зара» (М). 13.50—«Шчаслівая». Канцэрт сучаснай рускай песні і танца (М). 14.20—«Подзвіг» (М). 17.30—«Аптымістычная трагедыя». Мастацкі фільм (М). 19.25—канцэрт.

9 сакавіка

Першая праграма. 16.40 — праграма перадач. 16.45 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Выстаўка Бурацінa» (М). 17.15—«Залог поспеху». Пра лабараторыю навуковай арганізацыі працы на заводзе імя Кірава. 17.40—тэлевізійныя навіны. 18.00—матчавая сустрэча плыўцоў. Мінск—Варшава. 18.55—насустрач XXIII з'езду КПСС. «Нашы інтэрв'ю». 19.25—школьная фільматэка. Для вучняў 10—11-х класаў. «Нахлебнік». Мастацкі фільм. 21.05—тэлевізійны клуб «Колас». «Прырода і мы». Віктарына. Першы тур. 22.00—дзённік Спартакіяды народаў СССР (М). 22.15—у эфіры — «Маладосць». «Арбіта» (М).

Другая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—канцэрт (М). 11.45—«На прасторах Радзімы» (М). 17.15—ленінскі універсітэт мільёнаў. «Расія будзе сацыялістычнай» (М). 17.40 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00—«Калі горад спіць». Тэленарыс пра начныя службы метро (М). 18.30—«Знаёмства з операй». П. І. Чайкоўскі. «Мазепа». Спектакль Пермскага опернага тэатра. Перадача з Пермі. У антракце—тэлевізійныя навіны (М).

10 сакавіка

Першая праграма. 14.30 — праграма перадач. 14.35—для школьнікаў. «За кулісамі школьнага тэатра». Перадача з Кіева. 15.30—першынство свету па хакеі. ЧССР—Канада. Перадача з Любляны. 18.10 — для старшакласнікаў. «Вакуум і вакуумная тэхніка». Вядзе перадачу інжынер лабараторыі электронікі АН БССР Ул. А. Галасаў. 18.40 — тэлевізійныя навіны. 19.00—першынство свету па хакеі. СССР—Швецыя. Перадача з Любляны. У перапынку—дзённік Спартакіяды народаў СССР (М). 21.30—«Эстафета навін» (М). 22.30—«Беларускі гумар». Інсцэніраваныя апавяданні К. Крапівы, Я. Каршукова, Л. Арабей. Жарты, гумарэскі, народныя анекдоты.

Другая праграма. 18.10 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 19.00 — «Дванаццатая ноч». Мастацкі фільм. 20.30—канцэрт майстроў мастацтваў Туркменістана.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. У. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25 адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» —орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 00802